Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 27 (3931)
ЧАЦЬВЕР, 29 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

КОЖНЫ КАЛГАСЬНІК І АДНААСОБНІК

ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ АДОЗВУ СНК СССР І ЦК УсеКП(б) АБ КАНТРАКТАЦЫІ

Шклоўскі раён--першы ў БССР прыступіў да рэалізацыі пастановы аб контрактацыі

Калгасцэнтр БССР запрапанаваў усім калгасам выдзеліць брыгады лепшых калгасьнікаў для папулярызацыі адозвы сярод беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў

Шклоўшчына арганізуе шырокую прапрацоўку адозвы

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Падрабязна абмеркаваўшы адозву СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб контрактацыі, бюро Шклоўскага райкому партыі дало дырэктыву па партыйнай, камсамольскай, савецкай і капэрацыйнай лініі неадкладна разгарнуць шырокую папулярызацыю адозвы і рэалізацыю намечаных ёю мерапрыемстваў.

Да 5-га лютага адозва павінна быць прапрацавана на адкрытых нечарговых сходах партыйных і камсамольскіх ячэек з прыцягненнем шырокага ўдзелу беспартыйных усяго раёну. Тое самае павінна быць зроблена і па лініі прафсаюзаў.

Райком прымае меры, каб да 10-га лютага адозва па пытаньні аб контрактацыі была абмеркавана на спэцыяльных сходах калгасьнікаў і бедняко ў і сераднякоў — аднаасобнікаў, а тансама мабілізавана ўвага сялянскіх мас вакол задач, якія высоўвае адозва.

Раённая газэта «Прамень камуны» выпускае спэцыяльны лістон, прысьвечаны адозьве, для распаўсюджаньня яго сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

У сельсаветы накіроўваюцца работнікі для ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па папулярызацыі адозвы СНК і ЦК УсеКП(б)

Ян.

Дабіцца пералому ў справе загатовак ільну

Пастанова Савету Народных Камісараў і Эканамічнай нарады БССР

Заслухаўшы даклад НКГандлю БССР «Пра ход ільназагатовак», Савет Народных Камісараў і Эканамічная Нарада БССР а д з н а ч а ю ц ь:

а) ход загатовак ільну ў студзені месяцы (на 25-1 выканана 25 проц. пляну) зьяўляецца злачынна слабым. Гэтым самым дапушчан зрыў забесьпячэньня сырцом прамысловасьці і экспарту;

б) паказаны ход загатовак зьяўляецца вынікам адсутнасьці масавай работы сярод батрацтва, калгасьнікаў і беднаты, яўнага папушчэньня кулаком і заможнікам пры выкананьні даных ім цьвёрдых заданьняў і недаацэнкі значэньня гэтых загатовак з боку загатоўчых арганізацый і раённых выканаўчых камітэтаў раду раёнаў, што расцэньваецца як наяўнасьць горшага віду правага апартунізму на практыцы і дапушчэньня самацёку у рабоце па выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній;

в) з боку НКГандлю быў зусім слабы кантроль за выкананьнем дырэктывы СНК і ЭКАНА па ўзмацненьні ільназагатовак.

Выходзячы з вышэй адзначанага, Савет Народных Камісараў і Эканамічная Нарада п а с т а н а ў л я ю ц ь:

1. Усім загатоўчым арганізацыям і раённым выканаўчым камітэтам НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ПАКАЗАНЫХ НЕДАХОПАЎ І БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ ДАБІЦЦА РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ У СПРАВЕ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ І ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ.

2. Дабіцца рашучага націску НА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНУЮ ЧАСТКУ ВЁСКІ ПА ВЫКАНАНЬНІ ДАНЫХ ІМ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЎСІХ ВІДАХ ЗАГАТОВАК.

3. З тэй прычыны, што рад тавары шоў, камандыраваных у якасьці ўпаўнаважаных Савету Народных Камісараў у раёны, ня выканалі сваіх абавязкаў па ўзмацненьні загатовак і вярнуліся ў Менск без дазволу СНК, абавязаць паказаных таварышоў, безадкладна, не пазьней 30-га студзеня г. г., выехаць у раёны.

4. Дадатковa камандыраваць у раёны для ўзмацненьня ільназагатовак 5-10 таварышоў—членаў СНК і ЭКАНА.

Сьпіс паказаных таварышаў устанавіць тав. Галадзеду з тым, каб яны выехалі на месцы не пазьней 1-га лютага г. г.

5. Абавязаць усіх упаўнаважаных ураду, якія едуць з дакладамі на раённыя зьезды саветаў, асноўную ўвагу ў сваёй працы на раёне зьвярнуць на выкананьне пляну загатовак ільну, іншых загатовак і на мабілізацыю сродкаў.

6. Гэту пастанову ўвесьці ў дзейнасьць па тэлеграфу.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. КАЛЕВІЧ.

28-га студзеня 1931 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР

Абгаварыўшы адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб правядзеньні кантрактацыі пасеваў у 1931 годзе, праўленьне Белкалгасцэнтру, надаючы правядзеньню кантрактацыі асаблівае важнае значэньне ў разгортваньні далейшага рашучага наступленьня па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты, у разгортваньні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва, як клясы, пастанаўляе:

1) Абавязаць усе райкалгасаюзы і праўленьні калгасаў безадкладна разгарнуць работу па растлумачэньні адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб значэньні кантрактацыі для правільнай арганізацыі калектыўнай вытворчасьці і далейшага разгортваньня калгаснага руху.

Работу па растлумачэньні адозвы неабходна арганізаваць так, каб кожны калгасьнік быў азнаёмлены з адозвай і значэньнем кантрактацыі.

2) Паставіць на ўсіх выбарчых сходах калгасьнікаў спэцыяльныя даклады аб растлумачэньні адозвы і значэньні кантрактацыі. Абавязкова зачытваць на ўсіх перавыбарчых сходах адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб правядзеньні кантрактацыі, прымаючы на гэтых сходах практычныя прапановы аб кантрактацыі калгасамі сваіх пасеваў і таварнай часткі жывёлагадоўчай галіны гаспадаркі.

У тых калгасах, дзе перавыбарчыя сходы ўжо праведзены, склікаць спэцыяльныя сходы калгасьнікаў з запрашэньнем навуковых аднаасобнікаў для растлумачэньня адозвы аб кантрактацыі.

3) Прапанаваць райкалгасаюзам уключыць у парадак дня раённых зьездаў пытаньне аб правядзеньні кантрактацыі калгасамі і аказаньні дапамогі ў правядзеньні кантрактацыі сярод аднаасобных гаспадарак.

4) АБАВЯЗАЦЬ РАЙКАЛГАССАЮЗЫ І ПРАЎЛЕНЬНІ КАЛГАСАЎ У ПЯЦІДЗЕННЫ ТЭРМІН ВЫЛУЧЫЦЬ З КОЖНАГА КАЛГАСУ БРЫГАДЫ З ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ У ЛІКУ НЯ МЕНШ 3-Х ЧАЛАВЕК ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ АБ ЗНАЧЭНЬНІ КАНТРАКТАЦЫІ СЯРОД БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ МАС ВЁСКІ, ПРАВОДЗЯЧЫ ЎСЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ ПАД ЛЕЗУНГАМ РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ.

РАЙКАЛГАССАЮЗАМ ПРАВЕСЬЦІ ІНСТРУКЦЫЙНЫЯ НАРАДЫ ВЫЛУЧАЕМЫХ БРЫГАД І ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КІРАЎНІЦТВА РАБОТАЙ ІХ.

5) Шырока растлумачваючы значэньне вялізарнейшай вытворчай дапамогі з боку пралетарскай дзяржавы, якая аказваецца ў вялізарнейшых разьмерах сельскай гаспадарцы, у перабудове яе на сацыялістычны лад, у выніку пасьпяховага выкананьня толькі першых двух год пяцігодкі — неабходна мабілізаваць усе сілы, усю энэргію і ініцыятыву калгасных мас на пасьпяховае выкананьне заданьняў трэцяга году пяцігодкі, на разгортваньне на аснове марксыцка - ленінскіх прынцыпаў сацыяльнай капактывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва, як клясы.

Необходна арганізаваць рашучую барацьбу з кулацтвам, якое процідзейнічае і іменнецца сарваць пасьпяховае правядзеньне кантрактацыі, адначасова змагаючыся з правазарушэньнямі і недаацэнкай значэньня кантрактацыі.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

Калгас „Завет Леніна“—

змагар за тэхнічныя культуры

Плянам другой бальшавіцкай вясны прадугледжваюць значнае павялічэньне плошчы пасеву тэхнічных, прапашных і гародных культур у БРАГІНСКІМ раёне.

59 калгасаў павінны засеяць увесну гэтага году 5.815 ГЭКТАРАЎ, у тым ліку бульбы—30,45 проц., гарохплодаў—3,84 проц., ільну і капалель—8,04 проц., гародніны—3 проц. Акрамя таго сюды ягіч трэба дадаць канюшыну.

Параўнальна з мінулым годам калгасы павінны павялічыць плошчы ільну на 17 проц., бульбы—на 65 проц., коранплодаў—на 225 проц., гародаў—на 500 проц. і тытуню—на 220 проц.

План пашырэньня яравога кліну прадугледжвае асваеньне бросавых зямель, ворыва выгонаў. Павялічэньне плошчы ў пасобных калгасах дасягае ад 3 да 15 проц.

Весткі, атрыманыя з розных сельсаветаў, сьведчаць, што ў некаторых калгасах праяўлены беразадказныя адносіны да прапрацоўкі пляну весенняй сяўбы. Так, кіраўнікі калгасу «Шлях да сацыялізму» не згадзіліся з кантрольнымі лічбамі райкалгасаюзу і сталі на апартуністычны шлях скарачэньня плошчы тэхнічных культур і бульбы.

Затое прыкладам для ўсіх іншых калгасаў раёну можа паслужыць калгас «Завет Леніна», які налічвае 32 гаспадаркі, 58 працаздольных чалавек і 102 гэктары яравога кліну.

Агульны сход гэтага калгасу пастанавіў пашырыць пасеўную плошчу на 7 гэктараў, засеяць 32 гэкт. бульбы, 5 гэкт. коранплодаў, 4 гэкт. гародніны, 2 гэкт. тытуню, 9 гэкт. тэхнічных культур, цалкам скарачаючы чорны папар.

Калгасы БССР, бярэце прыклад з калгасу «Завет Леніна»—змагара за тэхнічныя культуры, за сацыялістычную спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі.

МОЛАТ.

Прыгарадныя гаспадаркі каапэрацыі--у цэнтр увагі

У агульнай сыстэме мерапрыемстваў па правядзеньні ў жыцьцё дырэктыў партыі ў галіне карэннага паляпшэньня справы рабочага забесьпячэньня галоўнейшую ролю адыгрывае пытаньне аб узмацненьні і далейшым разьвіцьці прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі, як магутных крыніц дадатковых харчовых рэсурсаў.

Ажыцьцяўленьне плянаў разьвіцьця прыгарадных гаспадарак набывае ў сучасны момант выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне і павінна прыкаваць да сябе увагу ўсіх арганізацый КП(б)Б, усёй рабочай грамадзкасьці. Іменна так паставлена пытаньне аб ролі прыгарадных гаспадарак апошнім пленумам ЦК КП(б)Б.

«Пленум ЦК зварачае асаблівую ўвагу ўсіх партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый, асабліва Наркамзему і гарсавету, на необходнасьць канцэнтраваньня максымуму ўвагі ва ніп гэтага важнейшага мерапрыемства ў справе паляпшэньня рабочага забесьпячэньня і прапануе штодзённай практычнай дапамогай поўнасьцю ажыцьцявіць план разгортваньня прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі».

Між тым, ня гледзячы на ўсё значэньне прыгарадных гаспадарак, прыходзіцца канстатаваць, што становішча на гэтым вучастку работы яўна НЕЗДАВАЛЬНЯЧАЕ і патрабуе неадкладных і самых рашучых мер паляпшэньня.

Трэба проста сказаць, што пытаньні будаўніцтва прыгарадных гаспадарак яшчэ да гэтага часу ў цэлым радзе выпадкаў не заняли належнага месца ў рабоце як партыйных і савецкіх арганізацый, так і самой каапэрацыі. Дзесьні-дзе планы разьвіцьця прыгарадных гаспадарак сустрэкаюць простае супраціўленьне, назіраецца апартуністычная тэндэнцыя зьнізіць вызначаныя лімиты і заданьні, што асабліва ярка выявілася пры адводзе зямельных вучасткаў.

Невыстарчальная ўвага і недаацэнка прыгарадных гаспадарак з боку Белкаапэрацыі, ЦРК, прафсаюзных арганізацый, Наркамзему і гарадзкіх саветаў прывяла да таго, што заданьні па вызначаных плянах у маштабе БССР аказаліся невыкананымі. Асабліва пагражаюча стаіць справа па лініі якасных паказальнікаў.

Урадлівасьць у прыгарадных гаспадарках вельмі нізкая, дагнаі жывёлы на маёчных фермах зусім недзвальнячэ, што цягне за сабою нізкі ўдой малака; плян асобнага кварталу па адкорме сьвіней сарваны, безгаспадарчасьць разьдае прыгарадныя гаспадаркі, шмат недаховаў назіраецца і ў галіне арганізацыі працы. З такім сумным балянсам падыйшлі арганізацыі, адказныя за разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак, да новага гаспадарчага году.

Мірыцца з такім становішчам надалей ніяк нельга. Трэба неадкладна дабіцца рашучага зруху ў бок паляпшэньня ўсёй пастаноўкі справы ў прыгарадных гаспадарках, забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі ў гэтым напрамку.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па справаздачным дакладзе Белкаапэрацыі даў галавую праграму разьвіцьця прыгарадных гаспадарак. Вось гэтыя асноўныя заданьні: адвод зямель у разьмеры 25.000 гэкт., правядзеньне зямляўпарадчых работ, засеў 5.600 гэкт. пад агародныя культуры, правядзеньне малочнага стада да 12.000 штук, адкормачных сьвіней — да 60.000 штук, дасягненьне парніковых гаспадарак да 50.000 рам.

За ажыцьцяўленьне гэтай праграмы трэба ўзяцца неадкладна і па-баявому. Сюды павінен быць накіраваны максымум увагі каапэрацыйных органаў, павінна быць поўнасьцю забясьпечана дапамога усіх арганізацый, якіх датычаць пытаньні будаўніцтва прыгарадных гаспадарак.

УСЯ РАБОТА КААПЭРАЦЫЯНАЙ СЫСТЭМЫ ПА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧАНА КАНКРЭТНЫМ ШТОДЗЕННЫМ КІРАЎНІЦТВАМ З БОКУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ, УЗЯТА ПАД КАНТРОЛЬ УСЕЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

Асаблівую ўвагу трэба зараз скансэнтраваць на пытаньнях падрыхтоўкі прыгарадных гаспадарак да весенняй пасеўнай кампаніі.

Малюнак становішча, якое зараз ёсьць у гэтай галіне, выклікае трывогу.

ПЫТАНЬНЕ З АДВОДАМ ЗЯМЕЛЬНЫХ ВУЧАСТКАЎ ЯШЧЭ НЯ ВЫРАШАНА. Праўда, агульная адведзеная плошча, як быццам-бы дасягае разьмераў заданьня, але ў такіх буйных цэнтрах, як ГОМЕЛЬ І ВІЦЕБСК, АДВОД ЗЯМЕЛЬНЫХ ВУЧАСТКАЎ НЯ СКОНЧАН, і гэта пытаньне дасьць тоне ў нетрах ведамственных перапісак і разважаньняў. Такое-ж становішча назіраецца ў ЖЛОБІНЕ, ДОБРУШЫ і ў радзе іншых месц. ЯКАСЬЦЬ ВУЧАСТКАЎ, ШТО АДВОДЗЯЦЦА, ЧАСТА ВЕЛЬМІ НІЗКАЯ, сюды нярэдка ўваходзяць і бросавыя землі і цаліна. Разьмеры вучасткаў не гарантуюць ажыцьцяўленьня прынцыпу ўзбуйненьня гаспадарак. Асабліва вострa стаіць пытаньне з плошчай, што адводзіцца пад агароды.

Мясцовыя партарганізацыі і гарсаветы нярэдка праяўляюць яўную недаацэнку гэтых пытаньняў, а падчас і простае жаданьне прыкрыцца шчытом «аб'ектыўных» прычын.

Становішча з падрыхтоўкай насеньня, цягавай сілай, кормам, будаўнічым матар'ялам і рабочай сілай вельмі пагражаючае.

ЗАГАТОЎКА НАСЕНЬНЯ ДЛЯ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК ПРАХОДЗІЦЬ САМАЦЁКАМ. Таварныя фонды на гэтыя мэты сваячасова ня былі выпучаны. Пераважваюць разьлікі на «багатага дзядзечку» — прывозны насенны матар'ял. Унутры-ж БССР загатоўчая работа пастаўлена недзвычай дрэнна. Белкаапэрацыю яшчэ невядомы пэрспэктывы здавальненьня сваіх заявак Насеннаведсаюзам. Апошні ў сваю чаргу таксама праяўляе бездапаможнасьць. У выніку — насенны фонд для прыгарадных гаспадарак не забясьпечан. Так, па бульбе загатоўлена ўсяго 753 тоны замест патрэбных 4.414 тон, па капусьце — 23,2 кгр. замест 311 кгр., па гурках — 306 кгр. замест 3.885 кгр. і г. д.

НЯ Ў ЛЕПШЫМ СТАНЕ ЗНАХОДЗІЦЦА ПЫТАНЬНЕ З ЦЯГАВАЙ СІЛАЙ для прыгарадных гаспадарак. З патрэбных 2.447 коняй ёсьць 1.129. Загатоўка коняй ідзе недапушчальна слаба. З боку Белмапжывёласаюзу праяўляюцца ў гэтых адносінах сапраўдныя чарапашыя тэмпы. Наяўная механічная цягавая сіла далёка невыстарчальная. 10 наяўных і 11 замаражаных трактараў могуць пакрыць ня больш 30-35 проц. патрэб прыгарадных гаспадарак. Адсюль пастаўстае задача — знайсьці сродкі для ўзмацненьня тэхнічнай базы прыгарадных гаспадарак, прыстасаваць да патрэб апошніх плянаў работу Трактарацэнтру.

РАМОНТ ІНВЭНТАРУ І АБОЗУ НЕ РАЗГАРНУЎСЯ, хаця 50 проц. наяўных трактараў і значная частка сельска-гаспадарчых прылад патрабуюць рамонту.

Нельга не адзначыць, што СЛАБА ПАСОЎВАЕЦЦА ЎПЕРАД РАБОТА ПА РАЗЬВІЦЬЦІ ПАРНІКОВЫХ ГАСПАДАРАК. ВЯЛІКІМ ТОРМАЗАМ ТУТ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗАТРЫМАНЬНЕ ЧЫГУНКАЙ АДГРУЗКІ ГАТОВЫХ ПАРНІКОВЫХ РАМ, ЯКІХ НАКАПІЛАСЯ Ў МЕНСКУ ЗВЫШ 5.000 ШТУК.

Нарэшце, цэлай сыстэмы неадкладных мерапрыемстваў патрабуе задача забесьпячэньня прыгарадных гаспадарак рабочай сілай. Гэта работа павінна быць цесна ўвязана з пытаньнямі ПАЛЯПШЭНЬНЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ, У ТЫМ ЛІКУ З МЭХАНІЗАЦЫЯЙ ВЫТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ.

Да гэтага часу ні сам Белкаапэрацыю, ні ўся сетка спажывецкай каапэрацыі яшчэ не разгарнулі сапраўднай работы па падрыхтоўцы да надыходзячай весенняй пасеўнай кампаніі. Многія ЦРК яшчэ ня маюць нават вытворчых плянаў на прыгарадныя гаспадаркі.

Становішча, якое зараз ёсьць, не гарантуе выкананьня задач, што стаяць перад прыгарадныміі гаспадаркамі. Агульнымі намаганьнямі трэба дабіцца неадкладнага пералому ў гэтай рабоце, узяць сапраўды бальшавіцкія тэмпы, забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі.

Даючы рашучы адпор апартуністычнай недаацэнцы значэньня прыгарадных гаспадарак, змагаючыся з бюракратызмам і коснасьцю ў органах ЦРК, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу і кантролю найшырэйшыя масы працоўных, — мы даб'емся нарэшце паляпшэньня пастаноўкі справы ў прыгарадных гаспадарках, сустрэнем ва ўсеўзбраеньні другую бальшавіцкую вясну, рушым наперад ударным тэмпам справу паляпшэньня рабочага забесьпячэньня.

Энэргічная падрыхтоўка пралетарыяту да міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем

ПАРЫЖ, 22. Орган французкай кампартыі «Юманіта» публікуе адозву генэральнай унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы да ўсіх працоўных. Адозва прапануе працоўным рыхтавацца да масавага ўдзелу ў правядзеньні міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя і надыходзячай вайны. З гэтай мэтай рэкамендуецца ўсюды арганізоўваць камітэты барацьбы, камітэты беспрацоўных і праводзіць канфэрэнцыі адзінства ўсіх працоўных.

Палітбюро французкай кампартыі далучылася да адозвы генэральнай унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы, абавязала ўсіх членаў партыі праводзіць у жыцьцё вызначаныя ў адозьве мерапрыемствы.

* * *

БЭРЛІН, 24. Адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў беспрацоўных 50 бірж працы, на якой абмеркаваны мерапрыемствы па падрыхтоўцы да міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя—25 лютага. Канфэрэнцыя распрацавала праграму мерапрыемстваў і прыняла рэзалюцыю, у якой патрабуюцца патрабаваньні беспрацоўных.

* * *

ВЕНА, 23. Аўстрыйская кампартыя разгарнула работу па мабілізацыі мас беспрацоўных і работніц для правядзеньня міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем — 25 лютага.

Бурныя дэманстрацыі беспрацоўных у Кішынёве

ВЕНА, 27. Паводле вестак з Румыніі, у КІШЫНЁВЕ адбыліся шматлюдныя дэманстрацыі беспрацоўных. Напярэдадні дэманстрацый па ўсім горадзе распаўсюджваліся камуністычныя лятучкі, якія заклікалі рабочых змагацца супроць падрыхтоўкі вайны і выступіць пад сьцягам Леніна ў абарону Савецкага Саюзу і супроць жорсткага наступленьня капіталістаў на рабочую клясу. У дзень дэманстрацыі Кішынёў меў уражаньне ваеннага лягеру. Войска заняло ўсе грамадзкія будынкі, заводы, стараючыся не дапушчаць выступленьня беспрацоўных. Ня гледзячы на гэта, рабочыя, а асабліва рабочая моладзь, пад кіраўніцтвам камсамольцаў, вялікімі групамі дэманстравалі па вуліцах увесь дзень. Яшчэ да пачатку дэманстрацыі паліцыя арыштавала больш 200 чалавек. (ТАСС).

Нямецкія фашысты таксама рыхтуюцца

БЭРЛІН. Левая газэта «Вальт ам Абэнд» паведамляе аб патаемным пасяджэньні кіраўніцтва бэрлінскай арганізацыі нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў), якое адбылося гэтымі днямі. На пасяджэньні кіруючыя дзеячы фашыстаў паказвалі на необходнасьць прывесьці ўсе фашысцкія арганізацыі ў павышаную баявую гатоўнасьць, бо 25-га лютага—у міжнародны дзень змаганьня з беспрацоўем — прадстаяць «рашаючыя дзеяньні». Паводле слоў газэты кіраўнік бэрлінскай арганізацыі фашыстаў Гэбэльс заявіў, што баявыя арганізацыі «узброены да зубоў і знаходзяцца ў стане чаканьня».

Чан Кай-шы шле новыя арміі супроць чырвоных

Насельніцтва Кітаю актыў на падтрымлівае чырвоныя атрады

ШАНХАЙ, 27. Кітайскі друк піша аб новых баёх паміж чырвонымі арміямі і ваннінскімі войскамі ў паўднёвых правінцыях Кітаю. Афіцыяльныя крыніцы кожны дзень паведамляюць аб «перамогах» нанкінскіх войск над чырвонаармейскімі атрадамі, захапле савецкіх тэрыторый і аб ліквідацыі савецкіх органаў на занятых тэрыторыях. Мясцовыя колы адносяцца да гэтых пераможных рэляцый вельмі асьцярожна.

Замежны-ж друк публікуе даныя аб посьпеху чырвоных армій. Амэрыканская газэта «Юнінг Пост» піша, што 15 тыс. чырвонаармейцаў занялі вялікі раён у правінцыі Хунань. У правінцыі Цзянсі чырвонаармейскія атрады ўмацаваліся ў радзе гарадоў. З Нанкіну паведамляюць, што Чан Кай-шы загадаў выслаць новую армію ў 100 тыс. салдат у правінцыі Хубэй, Хунань і Цзянсі.

Узорны парадак на савецкіх тэрыторыях

ШАНХАЙ, 27. У буйных кітайскіх газэтах упэрэшыню публікуюцца весткі аб становішчы на савецкіх тэрыторыях. Газэта «Шэнь-Бао» публікуе паведамленьне аб становішчы ў Тунгу (правінцыя Цзянсі). У гэтым горадзе існаваў савецкі ўрад і ён зноў існуе пасьля выгнаньня нанкінскага войска чырвонаармейскімі атрадамі з гораду. За 3-тадовы перыяд існаваньня савецкі ўрад паводзіў склады для хаваньня рысу і ў выпадку голаду або засухі прадаваў насельніцтву рыс па цьвёрдай цане ў тры разы танейшай, чым у іншых раёнах. Насельніцтва гораду не адчувала патрэбы ў прадуктах, бо яны прадаваліся па вызначаных нізкіх цанах. У раёне былі школы для дзяцей і для дарослых і функцыянавала некалькі дарожных больніц, клінік і санаторый. У раёне была ўведзена адзіная савецкая грашовая сыстэма. Паводле заявы карэспандэнта, насельніцтва раёну Тунгу ня ведала голаду і недаяданьня. Карэспандэнт зазначае, што ўрашчэнне ў Тунгу нанкінскае войска «моцна пацярпела ад насельніцтва, якое цалкам перайшло на бок чырвонаармейцаў і дапамагло ім зноў заняць і ўмацаваць ў Тунгу».

Савецкая ўлада на поўна чы Кітаю

ТОКІЯ, 24. Яп піша кітайская прэса, у 2-х вёрстах навету Ванфін у прыгожным з Карэяй раёне (Цзянсьдао) устаноўлена савецкая ўлада. Зямельныя ўчасткі, буйныя, гарны і пасяўныя фонды разьмеркаваны паровну сярод сялян. (ТАСС).

Фашысцкі ўрад і фашысцкі сойм Польшчы

ЦЫНІЧНА ЗЬДЗЕКУЮЦЦА НАД АХВЯРАМІ „УЦІХАМІРАНЬНЯ“ ЗАХ. УКРАІНЫ і ЗАХ. БЕЛАРУСІ

ВАРШАВА, 27. 26-га студзеня польскі сойм атрымаў, нарэшце, магчымасьць паказаць поўнасьцю свой сапраўдны твар. У парадку дня стаялі інтэрпэляцыі украінскай фракцыі аб «уціхаміраньні» Зах. Украіны, пытаньне аб спыненьні судовага сьледзтва супроць арыштаваных перад выбарамі дэпутатаў і, нарэшце, пытаньне аб Берасьці. Дакладчык камісіі, пілсудчык Стронскі, пад гул ядавітых рэплікаў з боку дэпутатаў беспартыйнага блёку (пілсудчыкі поўнасьцю і палякі ухвалілі мерапрыемствы карных атрадаў), заявіў, што яны «любяць зьдзейснічалі на украінскае насельніцтва». Пэпэсавец Дзюбуа ўзмоцнена адгаворваўся ад рэвалюцыйных выступленьняў украінскіх сялян супроць польскіх памешчыкаў.

Украінскія прамоўцы, прадстаўнік «УНДО» і украінскіх радыкалаў — выступілі у ролі прасіцеляў і бедных сваякоў, выпрошваючых падачкі. Усе факты «уціхаміраньня», якія прыводзілі прамоўцы, былі з боку дэпутатаў беспартыйнага блёку спатканы зьдзекамі. Пілсудчыкі вялі сябе асабліва бесцэрэмонна. З лавак дэпутатаў беспартыйнага блёку пуляся рэплікі: «Так і трэба рабіць з бандытамі».

Прадстаўнік нацыянал-дэмакратаў выказаў думку, каб выкарыстоўваньне ваенных часьцей пры «уціхаміраньні» не пашкодзіла польскай дзяржаве і польскай арміі.

Міністар унутраных спраў Складкоўскі заявіў, што сабатажніцкая дзейнасьць на Зах. Украіне фінансавалася з-за мяжы і што ўрад меў два выхады: ці ваенна-палявыя суды, што выклікала-б расстрэлы, ці пусьціць у ход для ўціхаміраньня паліцэйскія школы. «Я лічу, — заявіў Складкоўскі,—што ўрад паступіў зусім гуманна, выбраўшы апошняе».

Прадстаўніку камфракцыі слова не далі.

Сойм прыняў рэзалюцыю, якая ўхваляе мерапрыемствы ўраду па «ўціхаміраньні». Потым сойм адмовіў у спыненьні судовага сьледзтва супроць арыштаваных перад выбарамі апазыцыйных дэпутатаў.

Позна ноччу пачалася дыскусія пакоут Берасьця. Прэм'ер Славэк выступіў з заявай ад ураду, у якой ён (урад) поўнасьцю ўзяў на сябе адказнасьць за Берасьце. Большасьцю галасоў пытаньне аб Берасьці было адкінена.

Мільёны--на ўтрыманьне прэзыдэнта

—капейкі галадаючым

«Газэта Варшаўска» ў № 25 піша, што ў 1931-32 годзе на ўтрыманьне прэзыдэнта польскай рэспублікі адпушчана 3 млн. 900 тыс. злотых. Як зазначае газэта, пэнсія прэзыдэнта Польшчы значна вышэйшая за пэнсію ня толькі нямецкага прэзыдэнта, але нават французскага і амэрыканскага.

Выдаткі прэзыдэнта падзяляюцца наступным чынам:

Сама пэнсія прэзыдэнта складае 909 тыс. злотых (у 1925 годзе—121 тыс. злотых), канцылярыя—2 млн. 341 тыс. 518 злотых (у 1925 годзе—272.326 злотых), розныя асабістыя выдаткі—87 тыс. злотых (4.000), асабістыя канцылярскія выдаткі—65 тыс. злотых (10 тыс. злотых), іншыя выдаткі — 395 тыс. злотых (114 тыс. злотых).

У параўнаньні з 1925 годам, як мы бачым, бюджэт у некалькі раз узрос, а гэта таму, што ўведзены яшчэ новыя дадатковыя выдаткі — на ўтрыманьне вайсковага габінэту — 1.258.482 злотых, спэцыяльны фонд для асабістага распараджэньня прэзыдэнта—60 тыс. злотых і рэзыдэнцыя ў Спале—181.085 злотых.

Трэба зазначыць, што фантычныя выдаткі на ўтрыманьні прэзыдэнта значна вышэйшыя, бо сюды ня ўключаны выдаткі, напрыклад, на ўтрыманьні, рамонце і ўпрыгожаньні розных рэпрэзэнтацыйных палацаў прэзыдэнта. Гэтыя выдаткі адносны на бюджэце міністэрства народнай асьветы і грамадзкіх работ. А між тым на гэта ў 1925 годзе было патрачана 928 тыс. злотых, а ў бягучым годзе асигнавана 2 млн. 928 тыс. злотых.

Ян прыгнае нават буржуазная польская прэса, бюджэт прэзыдэнта Польшчы ў два разы вышэйшы за бюджэт сэнату, вышэйшы за бюджэт міністэрства пошты і тэлеграфу, рады міністраў і г. д.

Чым-жа тлумачацца такія вялікія выдаткі на ўтрыманьне прэзыдэнта фашысцкай Польшчы, тым больш, што яны (выдаткі) з кожным годам усё павялічваюцца ў той момант, калі краіна перажывае цяжкі гаспадарчы крызіс, калі кожны дзень дзесяткі беспрацоўных гінуць ад голаду і холаду, а другія дзесяткі канчаюць самагубствам.

Ня будзем галаслоўнымі. Паслухаем, што кажа адносна гэтых выдаткаў прэзыдэнта сама буржуазная польская прэса. «У той час,—піша «Газэта Варшаўска» ў № 27,—калі прэзыдэнт Нямеччыны мае для свайго карыстаньня два аўтамабілі, дык у нас прэзыдэнт мае іх 22. На розныя «экскурсіі і палявańні» ў Спале з замежнымі гасьцямі асигнавана 181.085 злотых у год» і г. д.

Дырэктар-жа цывільнай канцылярыі прэзыдэнта—Лісевіч на бюджэтнай камісіі сойму адкрыта заявіў, што «павялічэньне выдаткаў прэзыдэнта выклікана павялічэньнем рэпрэзэнтацыйных выдаткаў, прыпісваючы выдаткі на прыём Вэнізалоса, брата японскага імператара, мітрапаліта Германоса, на зьезд міністраў земляробства» і г. д. Зразумела, тут нічога ня сказана пра выдаткі на прыёмы французскіх, румынскіх, патыскіх, фінляндзкіх і іншых генштабістаў, а таксама прадстаўнікоў розных антысавецкіх канфэрэнцый.

Такім чынам, мы бачым, што пераважная большасьць выдаткаў польскага прэзыдэнта зьвязана з прыёмам розных замежных «камізаляжораў»—на стварэньне антысавецкага блёку. Мы бачым, што ня толькі мільярды з бюджэту вяснага міністэрства, ня толькі розныя мільёны патаемных асигнаваньні з розных міністэрстваў, але нават большая частка выдаткаў прэзыдэнта накіравана на адну мату — на падрыхтоўку вайны супроць СССР.

Бунт 400 зьняволеных у Каранове

ВАРШАВА. Кракаўская газэта «Напшуд» падае: у адной з самых вялікіх турмаў Наморскай вобласьці ў Каранове каля Выдгошча, некалькі дзён таму назад узбунтавалася 400 зьняволеных.

У нядзелю, у поўдзень, у час раздачы абеду ў двары турмы зьняволеных пачалі нападаць турэмнічкам. Гэта прымусіла турэмную ўлады сродкі напаўжаньня. У нядзелю ўвечары зьняволеных пя выпусьцілі ўжо ў двор. Ноччу некалькі зьняволеных, якія знаходзіліся ў камерах на 3-ім паверсе, пробілі дзірку ў сьцяне і па канатах, пробленых з пасьцілак, спусьціліся ў двор. План уцечкі, адкуль быў заўважаны турэмны варгай і ліквідаваны.

ЭНЭРГІЮ І АКТЫЎНАСЬЦЬ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ МАС НАКІРАВАЦЬ НА:

РАЗГОРТВАНЬНЕ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІЗУ, УЗМАЦНЕНЬНЕ НАСТУПЛЕНЬНЯ НА КУЛАЦТВА, ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

„Недаацэнка і пасыўнасьць у рабоце па арганізацыі беднаты і батрацтва зьяўляецца адным з самых горшых праяўленьняў правага ўхілу на практыцы“.

(З пастановы ЦК КП(б)Б).

Асноўнае зьвяно

Ажыцьцяўленьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Партыйныя ячэйкі ізаслабна разгортвалі палітычна-клясавае выхаваньне батрацка-бядняцкіх мас. І ў гэтым раёне на 1 студзеня бяг. году мы маем 37,4 ПРОЦ. КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. Належная пастаноўка работы сярод беднаты дадатна адбівалася і на правядзеньні важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній у раёне. Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» выканана на 130 проц.; выкананы план збожжазагатовак і г. д.

Зусім процілегае — У ГАРАДОЦКАЙ партарганізацыі. Там партыйнае кіраўніцтва акацілася ў балота апортунізму. Райком на працягу апошніх 6-7 месяцаў ня толькі не кіраваў, а нават на станіў пытаньня аб работе з батрацтвам і беднатой. Групы беднаты ў раёне існуюць толькі на паперы! І ЎГЭТЫМ РАЁНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯЙ АХОПЛЕНА ТОЛЬКІ НА 6-7 ПРОЦ. Дрэнна праходзілі і важнейшыя палітычныя і гаспадарчыя кампаніі. План мабілізацыі сродпаў выкананы на 69 проц., пазыкі рэалізавана на 78 проц., збожжазагатоўкі выкананы на 85 проц. Ні ў адным калгасе не разьмеркаваны ўраджай. Вось вынік права-апартыністычнай практыкі ў рабоце сярод беднаты.

З гэтых двох фактаў кожны партыец можа ўпэўніцца наколькі вялікае значэньне ў ажыцьцяўленьні важнейшых палітычных задач партыі адыгрывае работа сярод беднаты, наколькі рашаючае значэньне яна мае ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

У бягучым годзе тэмпы калектывізацыі павінны быць павышаны. Гэтага немагчыма дасягнуць без арганізацыі батрацтва і беднаты вакол задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і далейшага ўзмоцненага наступленьня на кулацкія і капіталістычныя элемэнты вёскі. Таму работа сярод беднаты павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі кожнай райпартарганізацыі, кожнай парт'ячэйкі. Гэта работа павінна быць першараднай і галоўнейшай ва ўсёй дзейнасьці вясковых партарганізацый.

П—ка.

Разьбіць апартуністычную шкарлупу

Пастанова ЦК КП(б)Б аб весенняй пасеўнай кампаніі, даючы падрабязна распрацаваную праграму правядзеньня пасеўнай кампаніі, вымагае ад кожнай партыйнай арганізацыі неаслабна перакачыцца на ўдарныя тэмпы работы ў справе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі, у справе пырокага разгортваньня і рашучага паляпшэньня масава - палітычнай работы сярод батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас у мэтах арганізацыі далейшага прыліву ў калгасы.

У гэтым пытаньні ці можа мець месца разважаньне, спадзяваньне выканаць дырэктывы партыі пра самацёк.

А між тым такія адносіны да важнейшых дырэктыў партыі назіраюцца ў рабоце гомельскіх раённых устаноў, ды ня толькі раённых але і гарадзкіх. Апошнія лічаць, што справа падрыхтоўкі і правядзеньня весенняй сяўбы, справа далейшага наступленьня сацыялістычных элемэнтаў у вёсцы — гэта справа толькі вясковых арганізацый.

Атрыманы яшчэ ў сьнежні ад НКЗ канчатконы план размеркаваньня пасеўных плошчаў яравога кліну да апошняга часу ўсё прапаноўваўся РВК і толькі 13-га студзеня загаварджан РК і прэзыдыумам РВК. Прычым, ня гледячы на настанову ЦК КП(б)Б, якая катэгарычна забараняе скарачэньне пасеўных плошчаў, што ўстаноўлены НКЗ, — райвыканкомам пасеўныя плошчы па многіх культурах скарочаны (аднагадовыя травы на 256 гэкт., агароды — на 41 гэкт. і г. д.).

Збожжажаночышчальная работа ў раёне амаль не распачата. Яна распрацаванага пляну гэтай кампаніі. Нават саўгасы толькі зараз пачынаюць прыступаць да ачысткі насеньня, не гаворачы ўжо аб калгасах і адназобных гаспадарках. Такама нічога на вяроблена на гамонце сельска-гаспадарчага інвентару.

Работа праведзеная райвыканкомам у справе падрыхтоўкі да весенняй сяўбы, праходзіла вымучна апаратным шляхам. Ні партыйная, ні савецкая грамадзкасьць на гэту справу ў належнай меры не мабілізавана.

Партыйныя ячэйкі саўгасаў і калгасаў ніяк не абгаворвалі ў сваёй бюджэтнай пытаньні весенняй сяўбы, не мабілізавалі батрацка - бядняцкіх і серадняцкіх мас на выкананьне вызначаных плянаў, не арганізавалі сустрэчных плянаў сяўбы і не скарысталі ленінскіх дзён для энэргічнай работы па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Партарганізацыі недаацэньваюць палітычнага значэньня работы з беднатой, асобныя ячэйкі груба ігнаруюць дырэктывы партыі па гэтым пытаньні.

У выніку сучасная і мінулая права-апартуністычная практыкі раённых арганізацый і вясковых партыйных ячэек Гомельшчыны мае вельмі ніякі процант калектывізаваных гаспадарак. Нельга прайсьці міма і таго факту, што райвыканком і райком партыі да апошніх дзён займаліся «сочкацтвам», гаварачы, што процант калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак раёну дасягне 11. У апошнія дні райвыканком прыводзіць лічбу ў 7,8 проц. калектывізацыі гаспадарак раёну, а на справе процант ахопу калгасамі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак складае ўсяго 6,9 проц. Гэта ў той час, калі ў раёне налічваюцца дзесяткі буйнейшых прадпрыемстваў, у якіх працуюць тысячы рабочых.

Вельмі характэрна, што некаторыя раённыя працаўнікі імкнуцца тлумачыць ніякі процант калектывізацыі нацыянальнасьцю ў раёне фабрык і заводаў, на якіх працуе вагольная сялянства, і гэтым усклаўшчна задача калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Такія антыпартыйныя разважаньні маюць некаторае распаўсюджваньне і сярод раду членаў гарадзкой партыйнай арганізацыі. Гарпартарганізацыя не мабілізавала рабочых па дапамогу і кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што, дакуючы права-апартуністычным установам у працы раённых арганізацый, саўгасы аказаліся нядольнымі выканаць тыя задачы, якія на іх усклаўдзены.

У раёне ёсьць дасяткі фактаў прымірэнчых адносін да кулака. Па Зябраўскім сельсавеце няма ні аднаго абкладзенага ў індывідуальным парадку, у той час, калі ў радзе вёсак амат кулацкіх гаспадарак. Ва Ўлакаўскім сельсавеце невядома з якой прычыны вызвалены ад індывідуальнага абкладаньня чатыры кулацкія гаспадаркі.

Апісваючы нагул работу па калектывізацыі і падрыхтоўцы да весенняй сяўбы ў раёне, трэба палкам сьцьвердзіць з думкай старшыні райкому с.-г. і лясных рабочых, выказанай ім на нарадзе спецыялістаў, што ў Гомельскім раёне справай калектывізацыі ні адна з арганізацый да гэтага часу, на належыць, не займалася, што ні адзін саюз, ні адна ўстанова не займаліся пытаньнем падрыхтоўкі да весенняй сяўбы.

Мы лічым, што партыйныя органы павінны безадкладна праверыць, наколькі здольна кіраўніцтва Гомельскім сельскім раёнам забясьпечыць бязупынае выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы і праведзеньні весенняй пасеўнай кампаніі і наколькі яно здольна змагацца з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, змагацца па далейшы рост сацыялістычных элемэнтаў у вёсцы, за калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

М. Ганчарык.

Узор бальшавіцкай работы

БАБРУЙСК. (НАШ КАР.). У БРОСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ (БАБРУЙСКІ РАЁН) НАЗІРАЕЦЦА ШЫРОКІ РУХ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКАГА СЯЛЯНСТВА Ў КАЛГАСЫ. РАЗГОРНУТА ШЫРОКАЯ ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТА ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. ПАРТЫЙНАЯ ЯЧЭЙКА ЗДОЛЕЛА МАБІЛІЗАВАЦЬ БАТРАЦКА - БЯДНЯЦКІЯ МАСЫ НА ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ.

У ВЁСЦЫ СЛАБОДКА Ў ЛЕНІНСКІЯ ДНІ Ў КАЛГАС УСТУПІЛА 39 БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ. ЗАРАЗ СЛАБОДКА КАЛЕКТЫВІЗАВАНА НА 100 ПРОЦ. НА ХУТАРЫ БРОЖЖА АРГАНІЗАВАЎСЯ ГЭТЫМІ ДНЯМІ НОВЫ КАЛГАС. У ЯКІ ЎВАЙШЛІ ЎСЕ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ ХУТАРСКІЯ ГАСПАДАРКІ. У НЯДАЎНА АРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАС У В. МАКАРЭВІЧЫ ГЭТЫМІ ДНЯМІ ЎСТУПІЛА ЯШЧЭ 15 ГАСПАДАРАК.

ПАРТЫЙНАЯ ЯЧЭЙКА І СЕЛЬСАВЕТ ПРАВЯЛІ ЎЗОРНУЮ РАБОТУ ПА РАСТЛУМАЧЭНЬНІ І ДАВЯДЗЕНЬНІ ДА ПААСОБНЫХ ВЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ РАЙВЫКАНКОМУ АБ ЗАСЕВЕ ПЛОШЧАЎ ЯРЫННОЙ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІМ ЧАСЕЛЬНІЦТВАМ БРОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ Ў ПАРАДКУ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ ПАВЯЛІЧАНЫ НА 8,6 ПРОЦ.

МОЖНА ПРЫВЕСЬЦІ ДЗЕСЯТКІ ПРЫКЛАДАЎ, ЯК БАТРАКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ БРОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ АДГУКНУЛІСЯ НА ЗАКЛІК ПАРТЫІ АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ. АГ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. У В. ПАРХІМ КАВІЧЫ ВЫЛЫЯ ПАРТЫЗАНЫ ПРЫНЯЛІ ПАСТАНОВУ АБ АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСУ Ў АДНЯКУ СВАЕЙ ПОЎНАЙ АДДАННАСЬЦІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ І ГАТОЎНАСЬЦІ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЛЕНІНСКІХ ПЛЯНАЎ Ў ТРЭЦІМ РАШАЮЧЫМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ.

ВЯСНЯРОЧНА, ШТО ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ БРОСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ДАСЯГНУТЫ ТОЛЬКІ ПРЫ ПЯЎХІЛЬНЫМ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ. ПРЫ ЖОРСТКІМ ЗМАГАНЬНІ З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ І З ЯГО АГЭНТУРАЙ Ў ПАРТЫІ — ПРАВЫМІ І «ЛЕВЫМІ» АПАРТУНІСТАМІ. ПАРТ'ЯЧЭЙКІ БРОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗДОЛЕЛІ ПЕРАБУДАВАЦЬ СВАЮ РАБОТУ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ЗАДАЧАМІ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ ПАРТЫЯЙ ПЕРАД ВЯСКОВЫМІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯМІ Ў ТРЭЦІМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ. ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ПОЭТР ЎСЕЙ СВАЕЙ РАБОТЫ ПЕРАНЕСЬЛІ НА ПЫТАНЬНІ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ, РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ, ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ І ПРАЗ ГЭТА ДАСЯГНУЛІ ВЯЛІЗАРНЫХ ПОСЬПЕХАЎ Ў КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК СВАЙГО СЕЛЬСАВЕТУ.

ПРЫКЛАДАМІ ПАГОРШАЙ РАБОТЫ, СТАЎКІ НА САМАЦЁК, НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦІ І ПРАЯЎ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ МОГУЦЬ СЛУЖЫЦЬ РАБОТНІКІ ЛЮБОЧІЦКАГА, РАМАВЕЦКАГА, СЫЧКОЎСКАГА І КАВАЛЁЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ, ЯКІЯ МЯЖУЮЦЬ З БРОСКІМ УЗОРНЫМ СЕЛЬСАВЕТАМ ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. У ГЭТЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ ЯШЧЭ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ ДА ШЫРОКІХ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ — АДНААСОБНІКАЎ.

У Расьне... без перамен

АПАРТУНІСТЫ СКАЖАЮЦЬ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, ПРАЦЯГВАЮЦЬ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНУЮ ПРАКТЫКУ

Яшчэ ў сьнежні месяцы мінулага году «Зьвязда» пісала аб становішчы ў Расьнянскім раёне, аб недадольнасьці асобных работнікаў райкому і райвыканкому ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, аб фактах заціску самакрытыкі. Рэйкк КП(б)Б да гэтага часу не разгледзела па сутнасьці зьменчаных «зьвяздой», мітар'ялаў, не прабіла важнейшых арганізацыйных выводаў, не ўзмацніла кіруючых раённых органаў. Апартуністы, дзяльці, зажымшчыкі самакрытыкі застаюцца на сваіх пастах і да сённяшняга дня.

Апартуністычныя скажэньні лініі партыі больш усяго наглядаюцца ў пытаньнях калектывізацыі. Мы вымушаны сёньня падаць рад новых фактаў аб тым, як расьнянскія «парткіраўнікі», праводзяць генэральную лінію партыі.

Рад калгасаў засьмечан «былымі людзьмі», падкулачнікамі і кулакамі. Такога роду «калгасьнікі» прымаюць усе захады да аслабленьня калгаснага руху, да дэзарганізацыі бядняцкіх і серадняцкіх мас. У большасьці калгасаў ніяк не абмалочана збожжа, не разьмеркаваны ўраджай і зусім не распачата падрыхтоўка да весенняй пасеўнай кампаніі. У Расьнянскай камуне «Новы шлях», дакуючы шкодніцтву кулакоў і галавацяпеству апартуністаў як з раёну, так і з сельсавету, прадукцыйная жывёла знаходзіцца ў неданучмальных умовах: коровы размешчаны ў халодных хлявох, амаль пад адкрытым небам, ў той час, як дровы і іншыя рэчы складзены ў цёплых будынках.

Раённае кіраўніцтва літаральна не прыняло ніякіх захадаў, для таго, каб вытысьціць калгасы ад кулацка-варожых элемэнтаў. Толькі дакуючы таму, што кіраўніцтва райпартарганізацыі, кіраўнікі з райвыканкому сыстэматычную плянавую работу з беднатой падмяняюць стаўкай на самацёк, ігнаруюць палітычную важнасьць гэтае работы — у раёне няма зруху па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Назначны рост калгасу адбываецца выключна за кошт заможных і нават кулацкіх гаспадарак. Работнікі асобных парт'ячэек пры просьбе сваёй асобных работнікаў райкому ажыцьцяўляюць тэорыю правых апартуністаў «аб урастаньні кулака ў сацыялізм».

Старшыня райвыканкому Клімаў і яго намесьнік Лінкевіч, стаўшы на шлях апартуністычных скажэньняў лініі партыі, дакаціліся да крымінальных злачынстваў (самаазбесьцячэньне гэтых «кіраўнікоў» набывае шырокія размеры. Клімаў карыстаецца калгаснай сіроваей, трымае тры калгасныя сьвіні).

Гэтыя «дробязі» у сьпіце фактаў апартуністычнае дзейнасьці гаворыць аб поўным разлажэньні некаторых кіруючых работнікаў Расьнянскага раёну.

Мы лічым, што расьнянская РАЙКК павінна, нарэшце, праверыць наколькі здольны асобныя работнікі ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, ці можа ім даверыць партарганізацыя работу на адказных кіруючых пастах.

Шылянкоў.

Марудна, вяла, самацёкам

Падрыхтоўка да весенняй пасеўнай кампаніі ў Церакаўскім раёне праходзіць вяла нездавальняюча. Толькі зараз раёнскаяе аддзяленьне ўзяўся ў сельсаветы, калгасы і саўгасы пасеўныя плянны. Ні калгасы, ні сельсаветы, ні кіраўнічыя і гаспадарчыя нічога не зрабілі, каб пасеўныя плянны давесьці да шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — адноасобнікаў. Ні ў адным з сельсаветаў раёну, ні ў адным калгасе не арганізавана сустрэчнага пляна па правядзеньні і падрыхтоўцы да весенняй пасеўнай кампаніі.

Партарганізацыя, у сувязі з падыходам пасеўнае кампаніі, не паварнулася шырам да пытаньняў калектывізацыі, да палітычнае работы з беднатой і батрацтвам. Работа з беднатой застаецца адным з найбольш слабых і адстаных участкаў у рабоце ўсяе партарганізацыі.

У значнай частцы калгасаў яшчэ не закончана вялацьба і не прыступлена да разьмеркаваньня ўраджаю. Калгасьнікі на ведаюць аб выніках сваёй работы ў 1930 годзе, аб гаспадарчым становішчы калгасаў. Шырокія масы адноасобнікаў не інфармаваны аб посьпехах калгасаў за мінулы год. Усе гэта адбіваецца на становішчы калектыўнай работы.

Ар.

Сьпіць ячэйка— арудуе кулак

Рудаеская ячэйка (Пухавіцкі раён) не ўзьняла работы з беднатой на вышыню палітычных задач, не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі сельгаспітчнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ячэйка зусім не займаецца пытаньнямі гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пытаньнямі палітычна - масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Парт'ячэйка стаіць у баку ад змаганьня партыі за шпаркія тэмпы калектывізацыі, не арганізуе актыўнасьць працоўных мас сялянства і гэтым па сутнасьці садзейнічае клясаваму ворагу ў яго змаганьні супроць калгасаў.

Кулацкія і варожыя элемэнты, якія пралезьлі ў калгасы, праводзяць там разлагаючую дэзарганізатарскую работу. За апошнія дні адначаны выпадкі спайваньня кулакамі асобных бедняцкіх і батрацкіх.

Пухавіцкі райком партыі павінен праверыць, наколькі здольна кіраўніцтва Рудаеской ячэйкі змагацца з клясавым ворагам і забясьпечыць бальшавіцкае правядзеньне весенняй пасеўнай кампаніі.

Калгасьнік.

Апартуністычная стаўка на самацёк, на згоду з кулаком

Сеньненская партыйнае кіраўніцтва ня ставіла ў парадку дня змаганьне партыі за калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Лозунг калектывізацыі, жорсткай барацьбы з кулаком, лозунг ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі у Сеньне палічылі лозунгам апартуністычнага самацёку, лозунгам згоды з кулаком і наступнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм. Таму ня дзіва, што ўборачная і пасеўная весенняй кампаніі не зьявіліся стымулям для пранаганды ідэй калектывізацыі і ня былі раённым арганізацыямі скарыстаны для паказу шырокім масам сялянства бясспрэчнай карысьці ад замацаваньня правільных узаемадносін паміж калгасьнікамі, беднякамі і сераднякамі—адноасобнікамі.

Работа партарганізацыі у часе ўборачнай і пасеўнай кампаніі характарызуецца такімі фактамі. Распачатае будаўніцтва ў большасьці калгасаў ня скончана, сьвідчаючыя калгасы ўкамплектаваны толькі на 35 проц. Яшчэ ніводна ня скончана малацьба і ачыстка ільну ў калгасах і саўгасах. Ні выконаны плянавыя заданьні асобнага сакратару па вытворчым казнарачэйскі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Ня выконаны заданьні па падрыхтоўцы сяўбазвароцных плошчаў, па падрыхтоўцы будаўнічых матар'ялаў і г. д.

Работа партыйнай арганізацыі ня была сканцэнтравана вакол ажыцьцяўленьня важнейшых мерапрыемстваў партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ня была накіравана на два фронты—супроць правага апартуністу, ня больш абясьпечванага, і «левацкіх» наскокаў на лінію партыі. Яна ня адпавядала змаганьню ўсёй партыі за высокія тэмпы сацыялістычнага наступленьня. У сьвятле задач арганізацыі па вёсны характарным выявіцца тое, што работа раду вясковых карысных і камсамольскіх ячэек Сеньненскага раёну па калектывізацыі ня была прасякнута клясавым змаганьнем, не адлюстроўвала палітычнай лініі і сувязі з чым батрацка-бядняцкія масы палітычна-клясава навыхоўваліся. Арганізацыйна-гаспадарчыя мерапрыемствы, палітычныя кампаніі ня зьвязваліся з задачамі па калектывізацыі. Ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў, калі і стварыліся, то бяз ўдзелу партыйных і камсамольскіх ячэек.

Кулацкія элемэнты выкарыстоўвалі палітычную блізарукасьць, сьлепату раённага кіраўніцтва, бязьдзейнасьць вясковых ячэек у сваіх клясавых мэтах. Арганізоўвалі калгасы з заможна-кулацкіх гаспадарак, у якія для таго, каб замаскаваць кулацкую сутнасьць, бралі аднаго-двух беднякоў, уводзілі іх у правленьне, а на справе выкарыстоўвалі іх, як батракоў.

Кулакі. Масальскія і Паўлоўскія ў ролі арганізатараў калгасаў

Пры дапамозе раённых арганізацый, пры простай садзейнасьці алкаяных работнікаў райкому партыі, вядомым кулаком Масальскім быў арганізаваны кулацкі калгас. Масальскі без асабліваў трудасьцяў дабіўся атрыманьня крэдытаў на суму больш як 50.000 руб. для будаўніцтва ў калгасе ў той час, як сапраўдныя калгасы з бядняцка-серадняцкім складам не маглі атрымаць крэдыту на суму ў 1.000—2.000 руб. Масальскі з дапамогай даяржаўных крэдытаў абапіраў калгас у кулацкі форпост «обаяс», у вялікую кнітвечную кулацкую фэрму. У калгасе «Латыгаль», які быў арганізаван Масальскім і на чале якога стаяў той-жа Масальскі, увеходзіла 7 кулакоў, 5 заможнікаў і толькі адзін батрак і адзін бядняк. Гэтыя лічбы выразна гавораць аб гэтым «калгасе».

Па прыкладзе Масальскага кулак Паўлоўскі арганізоўвае калгас «Бурбін». У які таксама ўваходзіць індывідуальна-аладжтаваныя кулакі і які таксама ад даяржаны атрымлівае крэдыты. Паўлоўскі пастаўіў перад сабой задачу праз арганізацыю кулацкага калгасу пакарыць у вачох шырокіх мас працоўнага сялянства аўтарытэт ленінскай партыі, дыскрэдытаваць калгасны рух арганізацыяй ілжа-калгасу.

Кулак Паўлоўскі стараная выконваў сваю ролю. Але яму прышлося прыняць у калгас некалькі бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. Какі беднякі і сераднякі—калгасьнікі ўпэўніліся, што Паўлоўскі ідзе на шляху не стварэньня моцнага сапраўднага калгасу, а імкнецца зруйнаваць калгас, зьвесьці яго гаспадарку да нуля і гэтым прадмаістраваць перад калгасьнікамі і некалгасьнікамі—сялы заяўцуць калгасы працоўнае сялянства, а беднята ўпэўнілася, што Паўлоўскі арганізаваў калгас у сваіх клясава - кулацкіх мэтах і што ён выконвае ролю лютага ворага савецкай улады,—беднякі і сераднякі—калгасьнікі выключылі Паўлоўскага з калгасу, як кулака і контр-рэвалюцыянера.

Райком на варце інтарэсаў Паўлоўскіх

Аб выключэньні Паўлоўскага па заўтра ведалі ў Сеньненскім райкоме партыі. Што павінен рабіць у такім выпадку райком? Райком павінен быў падтрымаць ініцыятыву бедняко-калгасьнікаў, павінен быў паказаць шырокім масам працоўнага сялянства «двойнасьць Паўлоўскага», як ворага даяржавы пралетарскай дыктатуры, як разьюшанага ворага калектывізацыі.

Але гэтага не зрабіў Сеньненскі райком. На гэтым фактэ выразна выявілася, што лінія работнікаў Сеньненскага РК не адпавядае генэральнай лініі партыі.

У калгас «Бурбін» выстаў член бюро РК Красоўскі, які па сходзе калгасьнікаў дапамог заможна-кулацкім элементам вярнуць назад у калгас Паўлоўскага. Красоўскі характарызаваў Паўлоўскага, як напага чалавека», сапраўднага дапаможніка партыі, які рашуча і наадсёдна парваў са сваім кулацкім мінулым і стаў на шлях наўхільнага ажыцьцяўленьня лініі партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Красоўскі пераатрымаў Паўлоўскага з кулака ў змагара за калектывізацыю, у самага сумленнага і адданага савецкага працаўніка.

Пасьля таго, як Паўлоўскі пад напорам Красоўскага быў зноў прыняты ў калгас, загаварыла бедната на кулацкіх калгасах аб сувязі работнікаў райкому і райвыканкому з кулакамі Паўлоўскім, Шабэкам, Масальскім і іншымі. Райвыканком стварае спэцыяльную камісію, якой даручае дакладна высьветліць прычыну прасьледаваньня Паўлоўскага, як «ваяка» і арганізатара калгасу. Камісія «дакладна высьветлівшы адданасьць Паўлоўскага сацыялістычнаму будаўніцтву», знаходзіць, што Паўлоўскі сапраўды вельмі каштоўны чалавек і што «ён папярэдзе за ілжо»...

Пастановай камісіі (якая заняваецца алкаеднымі раённымі арганізацыямі) Паўлоўскі пераводзіцца ў лепшую камуну раёну ў якасьці камунара, кіраўніка і арганізатара. Пакуль камісія вывучала работу і «адданасьць Паўлоўскага сацыялістычнаму будаўніцтву» ён (Паўлоўскі) здолеў падрыхтаваць разбор калгасу «Бурбін».

Беднята і сераднякі, убачыўшы што лінія Красоўскіх нікольі не адрозьніваецца ад лініі кулакоў Масальскага, Паўлоўскага і інш., выйшлі з калгасу. Кулакі, як і трэба было чакаць, абвясьцілі аб факце развалу калгасу і разабралі сваё маёмасьць.

Потым загаварылі селькоры Палацкі і дзесяткі заметак у «Віцебскі пралетарый», «Савецкую Беларусь» і іншыя газэты. Сакратар райкому партыі Патапенка ў адказ на гэтыя заметкі піша ліст у рэдакцыі газэт у якім сьцьвярджае, што кампанія ўзьнятая супроць Паўлоўскага, ёсьць кампанія хлусьні, помсты з боку цёмных элемэнтаў. Патапенка ўпарта даказвае, што супроць Паўлоўскага ёсьць прасьледаваньні і пакаваньні, як гразвалага працаўніка, змагара за калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі. Патапенка пасьпяшаецца, што Паўлоўскі перакінут у камуну і гэтым самым будзе бакаваць ад далейшых прасьледаваньняў з боку ворожых элемэнтаў.

Фактычна на гэтым справа Паўлоўскага скончылася. Камісія прыняла да справы матар'ялы і выказы. Патапенка напісаў лісты с рэзалюцыі Красоўскага дапамог кулакам і заможнікам жорстка расправіцца з беднатой, задушыць яе ініцыятыву і вярнуцца ад калгаснай да сваёй дробнай гаспадаркі, стаць зноў на шлях сваіх продкаў...

Паўлоўскі спрабуе ўрачыстасьць перамогі над беднатой над калгасам, які быў развален яго рукамі.

Прышчэпавец Патапенка выконваў сацыяльны заказ кулацтва

Сакратар Сеньненскага райкому партыі Патапенка выконваў сацыяльны заказ кулацтва, сваёй пасадай і сваім партбілетам прыкрыў лютага клясавага ворага, дапамог гэтаму ворагу прыводзіць сваю кулацкую работу ў лепшай камуне раёну.

Дамо адну пістарычную давядку.

Патапенка працаваў разам з сынам Паўлоўскага ў земельных органах Віцебшчыны. Патапенка загадваў аддзелам Паўлоўскі загадваў радзіла ў Сеньненскім райвыканкоме. Як Патапенка, так і Паўлоўскі насоджвалі хутары, падтрымлівалі кулацтва і разбуралі савецкія, калгасныя гаспадаркі. Патапенка стары прыяцель Паўлоўскага.

Пакажам яшчэ і на тое, што Патапенка ў свой час дапамог Прышчэпаву ліквідаваць на Віцебшчыне 125 савецкіх гаспадарак.

«Работу» Патапенка можна характарызаваць і такімі фактамі:

Сакратаром Ульянаўскай партыйнай ячэйкі да апошняга часу быў Квяткоўскі — сын буйнога памешчыка. Квяткоўскі і Буйневіч (старшыня сельсавету) ня выконвалі заданьні, якія трэба было даводзіць да заможна-кулацкіх гаспадарак, заводзілі да сераднякоў і нават да беднякоў. Дзесяткі беднякоў і сераднякоў ападаткаваны індывідуальна, а дзесяткі кулакоў з дапамогай Квяткоўскага, Буйневіча і Патапенкі—«ураставшы ў сацыялізм».

Квяткоўскі, апіраючыся на кулацкія элемэнты, ігнаруючы беднату, вызваліў ад індывідуальнага ападаткаваньня і нават зусім ад абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам аднаго з моцных і буйных кулакоў Шабэку. Беднята, якая ня сваім сходзе прыняла пастанову аб індывідуальным ападаткаваньні Шабэкі, Квяткоўскім і Вепнеічам літаральна тарадзіваліся. Шабэка быў уведзен у склад групы бедняты пры сельсавеце. Кулак Шабэка ўвайшоў у калгас, які быў арганізаваны яго сынам Хаванным складзе тэтага калгасу ўсяго гаспадарак—9, з іх 8 кулацкіх і 1 серадняцкая.

Такі баланс работы Квяткоўскага і Буйневіча — дапаможнікаў Патапенкі, Красоўскага, Паўлоўскага, Масальскага і К°.

Сеньненскі райком праба ігнараваў дырэктыву партыі аб ачыстцы калгасаў ад кулацкіх і варожых элемэнтаў. На паперы былі прыняты пастановы, якія абвяшчалі райкалгасаюз «у двухтыдзневны тэрмін ачысьціць калгасы ад кулакоў», на справе ж Патапенка ажыцьцяўляў тэорыю правых аб стаўцы на кулацка-заможную гаспадарку, аб поступовым урастаньні кулака ў сацыялізм.

Кулацкая агэнтура адкрыта скажала генэральную лінію партыі. Змаганьне з правым ухілам было падменена простым падтрыманьнем і сваёдзейнасьцю апартуністам, праводзіць падрыўную варожую работу. Усё было накіравана на тое, каб заперці, затаўшыць ініцыятыву калгасьнікаў, беднаты, актыўнасьць радавой масы камуністаў.

РайКК, якая ў пытаньнях змаганьня з правым апартунізмам, з перагібамі, з скажэньнямі лініі партыі займала зусім правільную бальшавіцкую лінію, апартуністамі з райкому была ашальмавана, скампрамэтавана. Прапаўнікоў РайКК работнікі райкому на чале з Красоўскім Патапенкам пальмавалі на партыйных сходах, імкнучыся замазаць свае апартуністычныя скажэньні лініі партыі, захаваць ад партарганізацыі дапамогу, якую яны аказвалі кулацтву і варожым элемэнтам.

Між іншым, трэба ўказаць і на тое, што Патапенкі, Красоўскія, якія дапамагалі кулацтву змагацца супроць калектывізацыі, сваё прабываньне на кіраўнічых пасадах у раённых органах мэт. Можна прывесьці дзесяткі фактаў аб крымінальных злачынствах гэтае К-ы аб тым, як яны «разьмяркоўвалі шэйныя машыны, як выбракоўвалі ў камунах і калгасах сьвіней, як разьмяркоўвалі маемасьць ад раскулачваньня кулацкіх гаспадарак».

Варта прывесьці, што Квяткоўскі і Буйневіч прысвоілі на 5.000 руб. маемасьці, якая павінна была быць перадана ў калгас. Буйневіча за растрату і прысваеньне калгаснай маемасьці, за перагібы, адміністраваньне, за дапамогу кулацтву прыцягнулі да адказнасьці і справа аб ім была разгледжана сеньненскім нарсудом. Нарсуд у дзейнасьці Буйневіча не знайшоў элемэнтаў крымінальнай злачынасьці і, як і трэба было чакаць, апраўдаў.

Усё гэта мала адбіцца толькі пры літаральнай адсутнасьці разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, пры абсалютным яе заціску з боку кіраўнічай верхавіны.

Вяспрачна, што кіраўніцтва Сеньненскай партарганізацыі павінна быць тэрміновала і рашуча адарвалена. У партыі ня можа быць месца адрадніцкім агэнтам клясавага ворага тыпу

ЭПАР ПланСкан А2В

7-ы дзень выбараў у Менгарсавет

„Лінія партыі і саветаў— адна лінія“

ЧЫМ БОЛЬШ ПАСЬПЯХОВА САВЕТЫ БУДУЦЬ ПРАВОДЗІЦЬ ГЭТУ ЛІНІЮ, ТЫМ ВЫШЭЙ УЗЬНІМЕЦЦА ІХ РОЛЯ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ (МОЛАТАЎ)

75 ПРОЦ. ЧЛЕНАЎ ГАРСАВЕТУ—УДАРНІКІ.—ТЫСЯЧА НОВЫХ ЗАЯЎ У ПАРТЫЮ.—2.500 НОВЫХ БАЙЦОЎ - ЭНТУЗІЯСТАЎ ПЯЦІГОДКІ. — 90 ПРОЦ. ЯЎКІ НА ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ.—1.000 ПРАПАНОЎ ДА НАКАЗУ,—ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАЎ МЕНГАРСАВЕТУ.

7 дзён выбараў

Прайшло ўжо 7 дзён з пачатку перавыбараў Менскага гарсавету. Ход перавыбараў сьведчыць аб значна ўзрослай актыўнасьці і палітычнай сьвядомасьці рабочых мас. Перавыбары гарсавету ператварыліся ў дэманстрацыю адданасьці пралетараў гор. Менску генэральнай лініі партыі, іх непахіснай волі змагацца за бальшавіцкія тэзісы пабудовы сацыялізму, набліжа канчатковай перамогі, паперакор прароцтвам апартуністаў—ныцікаў і малавераў.

Такой актыўнасьці выбаршчыкаў, як у гэтым годзе, не назіралася ў мінулых перавыбарчых кампаніях. 88 проц. выбаршчыкаў — членаў саюзаў наведалі справаздачныя сходы. Дзякуючы актыўнасьці мас і шырокаму разгортванню бальшавіцкай самакрытыкі, удалося выкрыць апартуністычныя прарывы і памылкі ў рабоце Менскага гарсавету. Менскі гаркам КП(б)Б скасаваў пяць справаздачных сходаў, на якіх былі змазаны апартуністычныя памылкі Менгарсавету.

З вялікім уздымам праходзіць абгаварэньне наказу гарсавету XIII скліканьня. Сярэдняе наведваньне перавыбарчых сходаў перавышае 90 проц. Лічба на сходы на радзе буйных заводаў перавысіла ўсе меркаваньні. На выбарчы сход заводу «Камунар» прышлі поўнасьцю ўсе рабочыя. Вельмі добры прыклад яўкі далі паасобныя цэхі Менскага вузла. На сход зьявіліся парат рабочых, якія знаходзіліся ў адпачынку, толькі што прыехалі з лініі, мелі бюлетэнь на хваробе.

Кожны пункт наказу дапаўняўся дзесятнямі рабочых прапаноў. Да 26 студзеня прынята каля 1.000 рабочых прапаноў да наказу. Яны прасякнуты гарачым імкненьнем рабочай клясы прымаць самы актыўны ўдзел у перабудове работы гарсавету, узьняць яго ролю ў ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.

Галоўнае, чаго патрабуюць выбаршчыкі,—гэта, каб гарсавет быў баявым органам пралетарскай дыктатуры, каб ён быў цесна зьвязан з прадпрыемствамі, каб ён кіраваў рашаючым баямі трацяга году. Асаблівая ўвага аддана бытаньням узмацненьня абароназдольнасьці краіны. Рабочыя-выбаршчыкі патрабавалі ад новага складу гарсавету бальшавіцкай работы ў галіне дапамогі Чырвонай арміі, вялікацы насельніцтва і г. д.

Характэрная рыса паказу, што яны зьвяртаюцца двухбаковымі абавязацельствамі. Даючы паказ гарсавету, рабочыя бяруць на сябе абавязак выканаць прамфінплян трэцяга рашаючага году, асабліва яго якасных паказальнікаў, бязьлітасна змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі супроць правых і «левых» апартуністаў, прымірэнцаў і малавераў, ісьці наперад да новых перамог, да новых баёў за сацыялізм.

За час перавыбараў і ленінскіх дзён тысячы перадавых ударнікаў падалі заявы аб прыёме ў партыю. 2.500 рабочых ўліліся ў рады ўдарнікаў — байцоў за справу Леніна.

У гэты творчага энтузіязму мас нарадзіўся савет рашаючага году пяцігодкі.

Да 26-га студзеня выбрана 74 дэпутаты, з іх 75 проц. рабочых-ударнікаў, 65 проц. камуністаў і 15 проц. камсамольцаў. Трэба адзначыць малую колькасьць выбраных жанчын (20 проц.) і беспартыйных рабочых-ударнікаў (25 проц.).

Лепшых ударнікаў, якія давялі на справе сваю адданасьць заветам Леніна, трэба выбраць у дэпутаты гарадзкога савету.

Да сёньняшняга дня амаль ўсе буйныя прадпрыемствы кончылі перавыбары. У кампанію ўступілі дробныя прадпрыемствы і савецкія ўстановы. Пачаліся выбарчыя сходы ўтрыманцаў.

Трэба дабіцца, каб і гэтыя выбарчыя сходы прайшлі пры такой-жа актыўнасьці, як і ранейшыя.

„Дэкада штурму“ прарываў па ўсеагульным навучаньні ў ліквідацыі няпісьменнасьці

За подпісамі т. т. ГЕЯ І ГАЛАДЗЕДА ўсім гарадзкім і раённым камітэтам КП(б)Б, райвыканкомам і гарсаветам паслана тэлеграма аб правядзеньні з 1 да 10 лютага «ДЭКАДЫ ШТУРМУ» ПРАРЫВАЎ ПА УСЕАГУЛЬНЫМ НАВУЧАНЬНІ І ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ. Гаркомам і райкомам КП(б)Б, райвыканкомам і гарсаветам на працягу дэкады прапануецца:

дабіцца 100-процантнага ахопу ШКОЛАМІ — дзяцей школьнага ўзросту, перарослтаў і ЛІКПУНКТАМІ — рабочых, батракоў, калгасьнікаў, пераменнікаў, дэпрызыўнікаў і інш.;

забясьпечыць школы і ліквпункты педагагічнымі кадрамі, памяшканьнямі, абсталяваньнем, апаламі, гарачымі сьнеданьнямі і інш.;

дзяцей беднаты забясьпечыць вопраткай, абуткам, сшыткамі і г. д.;

арганізаваць вырубку і вывазку песаматар'ялу для будаўніцтва новых школ;

скончыць прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, МТС і разгарнуць работу па палітэхнізацыі;

Для кіраўніцтва «дэкадай штурму» пры райвыканкомах і гарсаветах арганізуюцца ШТАБЫ з прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафэсіянальных і кааперацыйных арганізацый.

98 проц. выбаршчыкаў

У дзень перавыбарчага сходу рабочыя менскай швэйнай фабрыкі імя Крупскай (1-ая зьмена) наладзілі дэманстрацыю ў гонар перавыбараў. Пасьля дэманстрацыі рабочыя стройнай калёнай прышлі ў клюб гарсавету на выбарчы сход. Зьявілася 98 проц. усіх выбаршчыкаў. Да абнагалосна прынятага паказу гаркому КП(б)Б сход дадаў свае прапановы: пастаніць на экранах гораду гарадзкія газэты, арганізаваць секцыю рабочага забясьпячэньня пры гарсавеце, адкрыць на фабрыцы імя Крупская маладнік, устанавіць аўтабусныя рэйсы з Плянту Волі да фабрыкі імя Крупскай. Асабліва каштоўныя прапановы ў галіне паляпшэньня быту ўнесьлі работніцы.

Сход сустрэў бурнымі воплескамі заяву трох рабочых-ударнікаў — Водзіча, Фэйгельмана і Абельсона аб тым, што яны ў 7-ую гадавіну сьмерці вялікага правадыра пралетарыяту Леніна і ў дні перавыбараў органаў пралетарскай дыктатуры просяць прыняць іх у рады партыі.

Мандаты дэпутатаў атрымалі: тав. Казлоўская—работніца - ударніца, камсамолка, тав. Рамановіч і Дзіменштэйн—работніцы - ударніцы, тав. Фэйгельман—ударнік, тав. Кашчанка — работніца-ударніца і тав. Рыскін—сакратар партканфэрэнцыі ЦКК, былы рабочы-швэйнік. У кандыдаты выбраны т. т.: Вольфсон—старшыня фабкому і Чуприс—ударнік.

М. САКАЛОЎСКІ.

Наладзіць праверку выкананьня наказу

210 чалавек з 338 зьявіліся на перавыбарчы сход калектываў рэдакцый газэт.

Да наказу ўнесена шмат далаткаў: правесьці трамвайную лінію на Ляхаўку, пабудаваць парк культуры і адпачынку, адкрыць дом адпачынку імя «пятага дня ўдарніка», пабудаваць цырк, павялічыць колькасьць трамвайных вагонаў, павялічыць колькасьць тэлефонных аўтаматаў, адкрыць лягерны гарадок для пінэраў. Сход прызнаў патрэбным наладзіць сыстэматычную праверку выкананьня наказу.

Дэпутатамі ў гарадзкі савет выбраны: т. т. **Будзінскі** (адказны рэдактар газэты «Зьвязда») і **Анташкевіч**—(рабочы-ударнік друкарні «Зьвязда»).

Кандыдатамі выбраны: т. т. **Бутомаў** (супрацоўнік газэты «Зьвязда») і т. **Левін**—(супрацоўнік газэты «Савецкая Беларусь»—рабочы-выдуўнец).

СКАСАВАНЫ перавыбарчы сход групкомаў МЦРК

Са спазьненьнем па дзьве гадзіны пачаўся перавыбарчы сход капектываў групкомаў № 1 і 4 МЦРК. Сабралася толькі 70 проц. выбаршчыкаў. Ніякай папярэдняй падрыхтоўкі да абгаварэньня наказу, як відаць, не праведзена. На працягу ўсяго сходу старшыня займаўся толькі тым, што заклікаў прысутных на шумець, сядзець спакойна, не перашкаджаць працаваць. Выбаршчыкі прымалі слабы ўдзел у абгаварэньні наказу — унесена толькі 15 далаткаў.

Да моманту абгаварэньня кандыдатур у гарсавет засталося менш палоны прысутных. Высунутыя кандыдатуры абгаварваліся толькі на бюро ячэйкі, масы ня былі прыцягнуты ў абмеркаваньне кандыдатур, рэкамэндацыйныя сьпісы ня былі вывешаны. Зусім ня правільна што выбралі дэпутатаў, выходзячы з агульнай колькасьці выбаршчыкаў, а не з сапраўднай колькасьці прысутных.

Брыгадзір «Зьвязды» АГРАНАЎ.

* * *

Заслухаўшы інфармацыі брыгадзіра «Зьвязды» і ўпаўнаважанага па перавыбарах, гарадзкая камісія пастанавіла скасаваць перавыбарчы сход групкомаў № 1 і 4 МЦРК.

Да наказу ўнесьлі 45 прапаноў

25-га студзеня ў клюбе мэталістаў адбыўся перавыбарчы сход рабочых майстэрні, інжынэрна-тэхнічнага персаналу і служачых Беларускага аддзяленьня электраабʼяднаньня. Зьявілася 94 проц. выбаршчыкаў. Да наказу ўнесьлі 45 новых прапаноў, якія абмяркоўваліся вольна жыва і горача. Аб сьядомых адносінах да наказу сьведчыць той факт, што сход амаль аднагалосна прааналіў прапановы аб зьмяншэньні платы за кватэры і пайў у ЖАКТы.

Цікавую прапанову ўнёс адзін інжынэр: перабясталяваць электра-сетку, паколькі з-за яе трацяцца шмат лішняй энэргіі. Існуючая сетка прасядоў разьлічана на малую нагрузку, і таму правады малаго сячэньня. Рост спажываньня электраэнэргіі і нагрузкі стацыі патрабуе перабясталяваньня сеткі.

У гарсавет выбраны тэхнік—член партыі і беспартыйны ўдарнік—сьлесар з 18 гадовым вытворчым стажам.

Ф. КУДЗІНОВІЧ.

На выбарчых сходах

21 студзеня адбыўся выбарчы сход рабочых канцэлярскага і ліцэйнага цэхаў чырвонасьцяжнага заводу «Энэргія». На сходзе павінна было прысутнічаць 400 чалавек, зьявілася 330. Слабая яўка тлумачыцца недаацэнкай палітычнага значэньня перавыбараў з боку цэхавых камітэтаў, якія ня ўжылі захадаў, каб забясьпечыць 100-процантную яўку.

Да наказу ўнесена 28 далаткаў.

Мандаты дэпутатаў аддадны 4-м дэлегатам, у ліку выбраных—дырэктар заводу Фішбэйн, рабочы-ўдарнік Грыжалеўскі і загадчык сэктару кадраў гаркому КП(б)Б тав. Каркачоў.

* * *

На сходзе рабочых шпалернай фабрыкі прынята 16 далаткаў да наказу. Падшэфная школа № 10 высунула свае запатрабаваньні новаму гарсавету. Школьнікі патрабуюць большай увагі школьнаму будаўніцтву, паляпшэньня забясьпячэньня бяднейшых дзяцей і г. д.

Дэпутатам выбран лепшы ўдарнік заводу тав. Далідовіч.

Пад сьцягам ленінскай партыі —да новых перамог

Фабрыка „Кастрычнік“—на перавыбарах

Калёна з 700 чалавек, пад гукі аркестру, выйшла з варот фабрыкі «Кастрычнік» і накіравалася на вуліцу Валадарскага ў кіно «Культура». Над калёнай стракацяць лёзунгі-плякаты, якія заклікаюць на выбарчы сход, да сур'ёзнага падбору дэпутатаў гарсавету XIII скліканьня, на які ўскладаецца адказная задача—кіраваць баямі трацяга рашаючага году.

Вялікая заля кіно «Культура» перапоўнена. 90 проц. выбаршчыкаў прысутнічае на сходзе.

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» па заслугах атрымала гакаровую назву чырвонасьцяжнай. Яна перамагла ў гэраічнай барацьбе за прамфінплян ударнага кварталу. Рабочыя перавыканалі прамфінплян. І зараз у сваім наказе гарадзкому савету яны даюць цьвёрдае абяцаньне ДАБІЦЦА ПЕРАМОГІ Ў ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ 1931 ГОДУ. Дзякуючы наўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, фабрыка занесена на чырвоную дошку, высунута адным з кандыдатаў на атрыманьне пераходнага сьцягу.

Рабочы калектыў фабрыкі ў дні перавыбараў яшчэ мацней згуртаваўся вакол партыі Леніна, каб пад яе кіраўніцтвам пайсьці па шляху да новых перамог. У ДЗЯНАКУ ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН І ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ 87 РАБОЧЫХ - УДАРНІКАЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў РАДЫ ПАРТЫІ

Перавыбарчы сход прайшоў пры вялікай актыўнасьці і высокай палітычнай сьвядомасьці рабочых. Кожны пункт наказу выклікаў шмат далаткаў. 500 рабочых прапаноў— уклад рабочых «Кастрычніка» у наказ Менгарсавету.

Асноўны пункт наказу—забясьпечыць выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, быць кіраўніком і арганізатарам новых сацыялістычных форм працы —сацспаборніцтва і ўдарніцтва, узмацніць барацьбу за генэральную лінію партыі, з правымі і «левымі» апартуністамі, энэргічна змагацца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Асабліва ўвага зьвернута на пытаньні абароназдольнасьці краіны.

— Мы добра ведаем,—заявілі рабочыя, — што капіталісты, шукаючы выхаду з цісной эканамічнага крызісу, рыхтуюць напад на краіну Саветаў. Мы павінны быць напагатове. Таму наша прапанова гарсавету—максімум увагі . аддаць абароназдольнасьці краіны, у 1931 г. пачаць збор сродкаў на пабудову дырыжабля імя Менгарсавету.

— Апартуністам, «левым», нацыянал-дэмакратам няма месца ў гарсавеце,—заявілі выбаршчыкі.

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» даверыла мандаты дэпутатаў 19-ці лепшым ударнікам, з іх 6 жанчын.

І. Л.

ВСНГБ затрымлівае палітэхнізацыю бабруйскага ФЗС

5-я ФЗС Бабруйску прымацавана да дрэваапрацоўчага камбінату. Навакол пытаньняў палітэхнізацыі школа мабілізавала шырокую грамадзкую думку. Актыў рабочых учёб рад канкрэтных прапаноў, якія былі пакладзены ў асновы ўмовы паміж школай і камбінатам. Умова разглядзена на пасяджэньні заўкому камбінату, падпісана і прынята адміністрацыяй. Паступова рэалізуюцца паасобныя пункты, за выключэньнем тых, якія павінны забясьпечыць матар'яльны бок школы. Згодна ўмовы, камбінат павінен выдаткоўваць сродкі на папаўненьне школьнай бібліятэкі, на абсталяваньне лябараторыі, мэханізаваных майстэрань, на ўтрыманьне інструктароў. Зразумела, што ў гэтай частцы кіраўніцтва камбінату зьвязана з ВСНГБ, які павінен быў даць адпаведныя ўказаньні.

Ужо прайшло некалькі месяцаў, як быў пасланы запрос у ВСНГ з праектам умовы і дагэтуль ніякіх дырэктыў няма. Рабочыя школы № 6 разам з настаўнікамі і вучнямі адпрацавалі дзьве зьмены і 4 гадзіны звыш нормы на карысьць школы, выклікалі на спаборніцтва іншыя цэхі камбінату, пастанавілі арганізаваць масавы суботнік у карысьць школы. ПК саюзу дрэваапрацоўшчыкаў таксама не дало заўкому камбінату дазволу на выдаткаваньне сродкаў на стыпэндыю бяднейшым вучням. Усё гэта разам узятае не дае магчымасьці школе выканаць свой сустрэчны плян. Актыў рабочых школы № 6 вынес пастанову ўзяць ВСНГБ па грамадзкі буксір і гэтым прыцягнуць яго на дапамогу палітэхнізацыі школы.

Бабакоў.

Аб арганізацыйнай структуры рабочай кааперацыі*)

(Паводле матар'ялаў ЦКК-РСІ)

Адным з асноўных крычых недахопаў работы рабочай кааперацыі выступіла адсім нерацыянальная арганізацыйная пабудова не, непрыстасаванасьць існуючых арганізацыйных форм рабочай кааперацыі да тых вялікіх задач, якія стаяць перад ёй. Такія буйныя прадпрыемствы, як менскі, гомельскі і віцебскі, маюць на 300-400 надпаравыданых ім крам, сталовых, буфетаў і г. д. Праўленьне прадпрыемства свайм апаратам не ахапляе ўсёй сваёй сеткі і таму самым капітальным лячэньнем хвароб рабочай кааперацыі выступіла наступны: «Праўленьне ня ведае, што робіцца ў нізавой сетцы». Гэтым тлумачылі залежны дэфіцытных тавараў у крамах, недабранаемыя абеды, гэтым хапат тлумачаць несвоечасовае выкананьне бюджэта, растратчыка, недастачы і г. д. Можа гэтыя тлумачэньні ня зусім вычарпальныя, але-ж факт застаецца фактам: «праўленьне ня ведае, што робіцца ў нізавой сетцы».

Бясспрэчна, што такое становішча ня можа існаваць надалей. У праграму мерапрыемстваў па паляпшэньні рабочага забясьпячэньня, і работы кааперацыі павінна быць уключана, як адна з асноўных задач — справа рацыяналізацыі апарату кааперацыі.

Абсталяваньне ЦКК-РСІ менскай і віцебскай кааперацыі, апошнія настановы пленуму ЦК і ЦКК УсесКП(б) і КП(б)Б ставяць перад намі пытаньне аб максімальным набліжэньні апарату кааперацыі да прадпрыемства і рабочага спажыўца.

Побач з наўхільным ажыцьцяўленьнем дырэктывы партыі аб арганізацыі на больш буйных прадпрыемствах БССР самастойных рабочых кааператываў, мы прапануем правесьці яшчэ рад мерапрыемстваў па дэцэнтралізацыі рабочай кааперацыі.

На ўсіх прадпрыемствах, дзе ёсьць разьмеркавальнік, сталовая, буфэт рамонтная майстэрня, дзе арганізаваны ці павінны быць арганізаваны сьвінарнік, птушнік, трусоўня, пральня, ясьлі і г. д.—арганізуецца закрыты кааперацыйны камбінат на прадпрыемстве.

У функцыі закрытага кааперацыйнага камбінату на прадпрыемстве ўваходзіць адзінае кіраўніцтва ўсімі пералічанымі вышэй кааперацыйнымі прадпрыемствамі. Камбінат распрацоўвае планы забясьпячэньня рабочых данага прадпрыемства, вывучае запатрабаваньні рабочых, забясьпечвае прадпрыемствы кааперацыі адпаведнымі прадуктамі і таварамі, абслугоўваючым штатам і інвэнтаром. Камбінат вядзе ўлік пайшчыкаў, прымацаваных да яго прадпрыемстваў, арганізоўвае рабочыя масы вакол работы кааперацыі. Камбінат арганізоўвае на фабрыцы, выкарыстоўваючы ініцыятыву пайшчыкаў, новыя мерапрыемствы па пашырэньні харчовай базы, на лепшым бытавым абслугоўваньні рабочых. Камбінат, па сутнасьці, зьяўляецца пераходнай ступенькаю да самастойнага рабочага кааператыву, які адрозьніваецца ад апошняга тым, што не арганізоўвае ўласнага тавараабароту, што ня мае ўласнага бляшэнсу і вядзе толькі першаначатковую справаздачу, працуючы пад агульным кіраўніцтвам цэнтральнага рабочага кааператыву.

Зразумела, што кіраўніцтва камбінату выбіраецца на сходзе рабочых данага прадпрыемства і працуе пад агульным кантролем грамадзкіх арганізацый і рабочых фабрыкі.

Што нам дасьць арганізацыя такіх закрытых камбінатаў? На нашай думцы, эфэкт будзе вялікі. Асноўнае тое, што рабочыя і грамадзкія арганізацыі будуць мець на фабрыцы адзінага гаспадара прадпрыемствай рабочай кааперацыі; будзе гаспадар, які змога сачыць за апаратам і яго работай, які зможа ўнязваць работу паасобных кааперацыйных прадпрыемстваў на фабрыцы і на гэтай базе арганізоўваць масы на паляпшэньне кааперацыйнай работы на прадпрыемстве.

Паводле гэтага мэтаду, цэнтральны рабочы кааператыў арганізоўвае кусты для індывідуальнага абслугоўваньня рабочых больш дробных прадпрыемстваў, служачых і інш. Кусты арганізоўваюцца на наступных прынцыпах: рабочыя і служачыя, непрымацаваныя да закрытых камбінатаў на прадпрыемствах, якія жывуць у пэўным раёне (Ляхаўка, Нарэсла, Кальварыя, Савецкая вул. і т. д.) прымацоўваюцца да кааперацыйнага кусту, у склад якога уваходзяць прадуктовая крама, крама хлеба, газы, на мясцовасьці, прамтавараая крама, сталовая і г. д. Усе гэтыя прадпрыемствы адзнаюцца адзіным загадчыкам кусту, які таксама арганізоўвае забясьпячэньне прымацаваных да гэтага кусту пайшчыкаў, кіруе апаратам, карыстаючыся прапам нашу і зваяльненьня, арганізоўвае масы пайшчыкаў вакол задач на рабочым кантролі і пашырэньні харчовай базы на аснове скарыстаньня мясцовых рэсурсаў.

Эфэкт ад арганізацыі такіх кустоў будзе таксама заключацца ў тым, што кааператыў будзе набліжаны да спажыўца, да яго спэцыфічных запатрабаваньняў, да ўмоў даныга раёну. Апарат кааперацыйнага кусту будзе ведаць, што робіцца ў яго 4-6 прадпрыемствах.

Арганізацыя закрытых кааперацыйных камбінатаў на прадпрыемствах і кустоў для абслугоўваньня індывідуальнага насельніцтва значна палегчыць работу праўленьня цэнтральнага рабочага кааператыву. Напрыклад, менскі цэнтральны рабочы кааператыў, замест 400 надпаравых яму адзінак, будзе мець каля 15 закрытых камбінатаў на прадпрыемствах і 15 кустоў. Мы друкуем схэму арганізацыйнай структуры кааператыву пасьля прыняцьця такой рэарганізацыі. З гэтай схэмы відаць, што замест раздробленай шматлікай сеткі крам, закрытых разьмеркавальнікаў, буфетаў, сталовых і г. д. праўленьне цэнтральнага рабочага кааператыву будзе ў асноўным кіраваць сеткай кустоў, камбінатаў. Зразумела, што арганізацыя камбінатаў і кустоў не азначае таго, што літаральна ўсе крамы, сталовыя і буфеты будуць абʼяднаны ў кусты — магчыма, што застануцца так званыя «дзікія» крамы і сталовыя, але-ж яны ні ў якім разе ня будуць перашкаджаць праўленьню ЦРК ператварыць сябе і свой апарат у пляноўчы і кіруючы орган рабочага забясьпячэньня ў горадзе, разгрузіўшы цэнтральны апарат ад дробязей і набліжэньня свае кіраўніцтва праз кусты і камбінаты да паасобнай адзінкі.

Мы ня можам абяцаць моўчкі пытаньня аб сайтасах, фэрмах рабочай кааперацыі. У асноўным арганізацыйнае кіраўніцтва застанецца на-старому. Усе сайтасы і фэрмы абʼядняюцца сэктарам сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў. Паасобныя агароды і фэрмы прымацоўваюцца да камбінатаў і кустоў, якія арганізоўваюць рабочыя масы на справу пралетарскага кантролю і дапамогу кааперацыі ў арганізацыі прыгарадняй гаспадаркі. Мы ўпэўнены ў тым, што праўленьне цэнтральнага, разгрузіўшы сябе ад кіраўніцтва шырокай сеткай крам, буфетаў і г. д., зможа значна больш увагі аддаць асноўным пытаньням рабочага забясьпячэньня, у прыватнасьці прыгарадняй гаспадаркі. З гэтага пункту погляду рэарганізацыя будзе мець бясспрэчна станоўчы ўплыў на работу прыгарадных гаспадарак.

Нас запытаюць, ці ня выклікае такая арганізацыя павялічэньня адміністрацыйна - гаспадарчых выдаткаў? Падрабязных падлікаў пача ня праведена. Магчыма, што павялічэньне адміністрацыйна - гаспадарчых выдаткаў будзе замацавана эканоміяй ад ліквідацыі бюро, ад лепшага скарыстаньня штату, ад скарачэньня апарату цэнтральнай бухгальтэрыі, стала пайшчыкаў і г. д.

Але-ж асноўная крыніца «эканоміі» будзе заключацца ў тым, што пры арганізацыі нізавога кіраўніцтва, пры мацаўнасьці кантролю над работай паасобных крам і сетак будзе значна менш растрат, значна менш злоўжываньняў, значна паскорыцца тавараперасоўваньне і тым самым палепшыцца рабочае забясьпячэньне. У апошнім заключаецца асноўнае значэньне гэтай рэарганізацыі.

Нельга марудзіць з прыняцьцем гэтай рэарганізацыі, калі яна акажацца прыймальнай, бо яна павінна быць цесна ўвязана з усімі мерапрыемствамі па арганізацыі самастойных рабочых кааператываў, на правядзеньні прымацаваньня і г. д. Таму чакаем хуткага разгаваньня ў выгляде дыскусіі вакол гэтага праекту на старонках «Зьвязды».

І. ВЕРБА.

*) У парадку абгаварэньня.

Набліжаецца фініш Усебеларускай культэстафэты

Стаўка на самацёк павінна быць біта

Партыйныя арганізацыі, забясьпечце бальшавіцкія тэмпы выкананьня пляну барацьбы за ўсеагульную пісьменнасьць!

Забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы

Праблема кадраў у рэканструкцыйны пэрыяд — рашаючая праблема сацыялістычнага будаўніцтва. Стварыць кадры з рабочых-калгасьнікаў, бядняка-серадняцкай часткі вёскі — гэта азначае ня толькі радыкальна палепшыць справу спэцыяльнай асьветы, але і адначасова весьці ўпартую барацьбу за ўсеагульную пісьменнасьць, за агульны ўзьдым культурна-палітычнага ўзроўню рабочых і сялянскіх мас.

Вядучымі мерапрыемствамі ў барацьбе за пісьменнасьць зьяўляецца ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня і ліквідацыя няпісьменнасьці— два мерапрыемствы, якія зьяўляюцца «важнейшай палітычнай задачай партыі ў бліжэйшы час». (Рэзалюцыя XVI партканфэрэнцыі).

Як выконваецца пастанова XVI зьезду УсеКП(б), пастановы СНК і ЦВК БССР аб усеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці?

1931 год — рашаючы год у які мы павінны вырашыць асноўную задачу ліквідацыі няпісьменнасьці. Плянам Наркамасьветы намечана на працягу 1930-31 году ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 477.825 чалавек. Гэта ў першую чаргу сярод вытворчых рабочых, сельгаспрацоўнікаў, калгасьнікаў, батракоў, членаў саюзаў рэшты насельніцтва да 40 год.

Гэтыя намечаныя паводле пляну перавышаюць лічбу ліквідаваўшых няпісьменнасьць за усе папярэднія гады. Выкананьне пляну патрабуе самай сур'ёзнай увагі з боку партыйных, прафсаюзных, асьветніцкіх арганізацый.

Між іншым, весткі з месц гавораць аб нагрозе зрыву выкананьня гэтага пляну. 85 раёнаў і 9 гарадоў на сёньняшні дзень ахапілі ліквпунктамі і індывідуальна-групавым навучаньнем усяго 262.254 чал., што складае 65.2 проц. намечанага пляну. Такія раёны, як Глускі, Стародзіны, Рускі, Маліеўскі Высачанскі, Клімавіцкі і г. д. —па сёньняшні дзень выканалі плян на 36-38-40 проц. Паводле рэстак з 20 раёнаў ахоплена ліквпунктамі вытворчых рабочых — 1699 чалавек, сельгаспрацоўных (па 21 раёне) 1.156 чал., батракоў (па 28 раёнах) — 1.114 чалавек, калгасьнікаў (па 32 раёнах) — ахоплена ўсяго 10.073 чалавека.

Яшчэ і дагэтуль шмат якія партыйныя арганізацыі ня сталі на чале кіраўніцтва справай ліквідацыі няпісьменнасьці Савецкія прафэсіянальныя, кааперацыйныя арганізацыі ў многіх месцах лічаць яму справу выключна справай органаў Наркамасьветы. Нізавыя прафарганізацыі не дапамагаюць на месцах ліквідатарам і культарміцам у гэтай справе. Ёсьць раёны (Краснапольскі, Бягомльскі, Уваранецкі, Расьнянскі і інш.), дзе кааперацыя зрывае работу ліквпунктаў, не адпускаючы газы. Камсамол—ініцыятар культэстафэты — мала што зрабіў практычнага ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

БССР перадае ўвесь ўсеагульнае абавязковае навучаньне. У гэтай галіне мы маем вялізарныя посьпехі. Але ёсьць тэндэнцыі сунакоцца на гэтых посьпехах.

З агульнае сумы мерапрыемстваў трэба асабліва працаваць над поўным ажыцьцяўленьнем трох задач: школьнае будаўніцтва, падрыхтоўка педагагічных кадраў, матар'яльнае забясьпячэньне бяднейшых вучняў. Між іншым, на месцах мы маем агідлівую нехапанку работы савецкага настаўніцтва, нуднае ігнараваньне пастановы ЦК партыі і СНК аб паляпшэньні матар'яльнага становішча настаўніцтва, аб забясьпячэньні настаўніцтва рабочым пайком. Патрэбна самая рашучая мера да тых галавацяпаў, якія кідаюцца пастановамі партыі і ўраду.

Нескарыстаныя сродкі, адпушчаныя на школьнае будаўніцтва, яркія сьведкі зрыву пляну ўсеагульнага навучаньня. У шмат якіх месцах нічога ня робіцца на дапамозе дзецям беднаты. Барацьба за колькасныя тэмпы ўсеагульнага навучаньня ў радзе месц праводзіцца без усямернага паляпшэньня якасьці навучаньня. Палітэхнізацыя школы, узмацненьне яе ролі як зброі камуністычнага выхаваньня, уплывае з-над увагі многіх паных партыйных, прафсаюзных, савецкіх арганізацый.

Прарывы ў правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці павінны быць ліквідаваны. Партыйныя арганізацыі павінны сапраўды стаць на чале кіраўніцтва гэтай важнейшай палітычнай справы. Толькі апартуністы могуць гаварыць аб немагчымасьці выканаць намечаныя пляны па ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульным навучаньні. У першую чаргу трэба накіраваць агонь на гэтай апартуністычнай пэдацэнцы, стаўшы на самацёк.

Трэці рашаючы год пяцігодкі патрабуе сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў работы па ўзьнясьці агульнага культурна-палітычнага ўзроўню рабочых і сялянскіх мас. Бальшавіцкія тэмпы павінны быць забясьпечаны.

Дзе зрыў усеагульнага навучаньня

Вушацкі раён. Мясцовыя раённыя арганізацыі не пакланяліся і на сёньняшні дзень забясьпечыць школы настаўнікамі. Для двухкамплектных прымітывак і школы 2-га канцэнтру не хапае 13 настаўнікаў. Школы малапісьменных на мажэ надручнікаў. Ліквпункты — праграм. Калгасы не адпускае ліквпунктам газы. Усеагульнае навучаньне ў раёне зрываецца.

Г. Я.

Глускі раён. Прайшоў месяц з таго часу, як друк сігналізаваў аб бязьдзейнасьці глускага райпатрабу культэстафэты спажывецкага т-ва, райпрафсавету ў справе правядзеньня ўсеагульнага навучаньня. Але справа не палепшылася. Большасьць школ не адрамантавана, няма апалу. Вопраткі і абутак бяднейшым вучням не выдаецца. Большасьць ліквпунктаў не распачала работы.

Брыгада.

Лельчыцы. Раённы інспэктарыят Асьветы мала зьвяртае ўвагі на ўсеагульнае навучаньне. Бяднейшыя вучні не забясьпечана, у той час, калі сродкі на бюджэце, адпушчаныя для гэтае мэты, ня зьмярстаны. Напрыклад, па Вобыльскім сельсавеце адпушчаныя на бюджэце на абсталяваньне школ 556 р.—зусім не скарыстаны. У кожнай школе сыстэматычна ня бывае на занятках 7-8 вучняў беднякоў з прычыны слабой матар'яльнай дапамогі. Фонды на дапамогу дзецям беднаты ня выкарыстаны, што можна пацьвердзіць прыкладам па тым-жа Вобыльскім сельсавеце, дзе па бюджэце з адпушчаных 540 руб. не скарыстана ні адной капейкі.

Спажывецкая кааперацыя па-галавацянску падышла да справы забясьпячэньня дзецей беднаты вопраткай і абуткам. Маюцца такія факты калі кааперацыя дасылае школам абутак для вучняў, які на сваім разьмеры можа быць скарыстаны толькі дзецьмі 3-4 гадовага ўзросту. Адзін з школ Вобыльскага сельсавету сабрана 100 руб. на дапамогу дзецям беднякоў. Грошы аналсам унесены ў Вялікую спажывецкую кааперацыю. Кааперацыя-ж дасылаючы абутак і вопратку, патрабуе з гэтай школы наяўнага разьліку. Спажывецкая кааперацыя нічога не зрабіла ў галіне забясьпячэньня школ гарачым сьнеданьнем. У выніку, ні ў адной школе Вульскага раёну няма гарачага сьнеданьня.

У Вульчыне—стаўка на самацёк

Культэстафэта, якая зараз праводзіцца, зьяўляецца генэральным паходам за культурную рэвалюцыю, на які павінна быць мабілізавана ўся савецкая грамадзкасьць. Ніводнасьць у гэтай рабоце ня можа інакш разглядацца, як агідлівае дэзэртырства з фронту культурнага будаўніцтва. Але, на вялікі жаль у Вульскім раёне гэты ўход з фронту набыў масавы характар на чале з райкультштабам. Апошні работаў культэстафэты не кіраваў, а калі што і рабіў, дык бяспляцнава, самацёкам, ня маючы ніякае сувязі з сельштабамі. У многіх сельсаветах гэтыя штабы зусім не арганізаваны, работнікі сельсаветаў ня ведаюць, што такое культэстафэта. Падрыхтоўка трацяга ўсебеларускага фінішу райкультштабам сарвана.

Што робіцца ў галіне ўсеагульнага навучаньня? Сталага нучоту дзяцей, падлягаючых усеагульнаму навучаньню, у раёне няма. Выўшы райінспэктар Яповін займаўся «очковтирательством», даючы дутыя лічбы аб стапроцантным ахопе дзяцей школамі. На справе школы да пачатку навучальнага году не зробілі неабходны рамонт

Што мы бачылі ў СССР

У лістападзе мінулага году лейпцыгская дэлегацыя саюзу чырвоных франтавікоў Нямеччыны наведала Савецкі Саюз. Ніжэй мы зьмяшчаем калектыўны артыкул нямецкіх таварышоў, які гаворыць аб іх уражаньнях ад падарожжа па Савецкай Беларусі і буйных цэнтрах СССР

Станцыя Негарэлае. Мы адразу адчуваем, што знаходзімся па бацькаўшчыне пралетарыяту.

Плякат з надпісам: «Мы вітаем пралетарыят Захаду»... Савецкая пацікутная вьявэда... Гэта тут зьнішчаны назаўсёды капіталістычны лад!

Дзвэвам «Рот фронт!» і дружным «Інтэрнацыяналам» вітаем мы краіну пралетарскай дыктатуры. Тут-жа нас спатыкае дэлегацыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Разам з ёю накіроўваемся ў Менск, каб там пабываць на сьвяткаваньні XIII гадавіны Кастрычніка.

У Менску мы агледзелі экспанаты Усебеларускай выстаўкі, фабрыку «Кастрычнік», гарбарню «Бальшавік», завод «Дрэваапрацоўшчык», мэталазаводы «Энэргія» і «Камунар». Мы былі сьведкамі плённых нынкаў высокавольтнай энэргіі пралетарыяту сталіцы Савецкай Беларусі.

Ня гледзячы на часовыя труднасьці, заработак рабочых павышаецца. Многія з іх рыхтуюцца ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і працуюць усяго 6 гадзін.

Пралетарыят былое прыгнечанае акраіны Расійскай Імпэрыі—БССР будуе сваю культуру, якая буйна і няўхільна ўзрастае. Адным з доваду гэтага зьяўляецца новы ўнівэрсытэцкі гарадок, у сьцепах якога мы атрымалі назву ганаровых студэнтаў. Мы абяцалі апраўдаць гэту назву, падвоіўшы энэргію ў барацьбе супроць буржуазіі!

Пасьля наведваньня адной школы мы атрымалі таксама годнасьць ганаровых пінэраў.

Наведалі часьці Чырвонай армії. Асновай не сапраўды зьяўляецца высокая клясавая сьвядомасьць, цьвёрдасьць, жалезная дысцыпліна. Чырвонаармейцы — змагаркі за сусьветны Кастрычнік! Характэрная дробязь: у адной з часьцей, у казарме, мы заўважылі на коўдрах каляровыя трыкутнікі, што паказваюць той бок, якім накрываюць ногі. Гэта вельмі гігіенічна, але чамусьці ў іншых часьцях мы гэтага не сустрэлі...

За ўвесь час нашага знаходжаньня ў Савецкім Саюзе мы не спатыкалі беспрацоўных. Наадварот, адчуваецца вялікі попыт на рабочую сілу. Гэта разьбівае ўшчэнт ліхвыя весткі сацыял-дэмакратычнага друку аб вялікім беспрацоўі ў Савецкай краіне.

22 лістапада мы паехалі ў Маскву. Яшчэ над'яжджаючы да Масквы мы заўважылі буйное будаўніцтва.

У Маскве мы былі ў Палацы Працы, на набудове дому ў 3.000 пакояў. Вечарам на мітынгу на заводзе «АМО».

Былі ў маўзалеі Леніна. Бачылі вялізарную жэманстрацыю пратэсту супроць шкодніцтва «прампартыі».

У Ленінградзе мы былі на вечары ў Народным Доме і пераканаліся, што там мастацтва сапраўды служыць пралетарыяту. Былі на «Красном Путиловце», дзе ў клюбе, разам з рабочымі, правялі вечар МОПР'у. Наведалі завод «Треугольник» і тэкстыльную фабрыку.

Надзвычай узрасло будаўніцтва ў ленінградзкім парту, асабліва вызначаецца гавань. На Волхаўбудзе мы агледзелі электрастанцыю і завод-гігант. Вялізарнейшае ўражаньне пакідае турбінная заля. Там, як можа нідзе, успомніліся словы Леніна:

— Камунізм — гэта савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны.

Пасьля вярнуліся ў Маскву і пабывалі на працэсе шкодніка.

Потым — зноў на Беларусь, у горад Віцебск. Агледзелі там швэйную і панчошную фабрыкі, наведалі рэдакцыю мясцовай газэты, дзе атрымалі яркае прадстаўленьне аб вялікай актыўнасьці рабкораў.

З Віцебску паехалі ў Гомель. Былі на пленуме гарсавету, наведалі гарком партыі, №-скі кавалерыйскі полк, дзе правялі час у пытаньнях і адказах з салдатамі рэвалюцыі. Прымалі нас усюды надзвычай прыязьна і шчыра. У апошні дзень наведалі запалкавую фабрыку, чыгуначныя майстэрні, чыгуначную варту.

Усюды адбываліся лятучыя мітынгі. Усюды было відаць гарачае жаданьне рабочых выканаць пяцігодку за чатыры гады.

Па ўсім СССР будуюцца новыя заводы, фабрыкі, школы, клюбы, жылыя памяшканьні. Асаблівая ўвага надаецца жаночай працы. На вытворчасьці ёсьць ясьлі. Усе рабочыя ў абедзены перапынак атрымліваюць танныя абеды. Сустрэчным плянам рупяць рабочыя СССР сваё сацыялістычнае будаўніцтва ўсё наперад і наперад.

Але ёсьць яшчэ і шмат недахопаў. Напрыклад, у многіх гарадох акраіны — у антысанітарным становішчы. Ёсьць шмат сутаржэньняў, брудных ям. У пасобных новых дамох адсутнічае вадаправод і каналізацыя.

Трэба значна павялічыць абмен вытворчым вопытам, бо часта старое для аднаго заводу — зьяўляецца вынаходніцтвам для другога...

Мы ўпэўнены, што рабочыя СССР з посьпехам выканаюць сваю пяцігодку за чатыры гады. Вярнуўшыся ў юнайскую Нямеччыну, мы раскажам сваім рабочым, як пралетарыят Савецкага Саюзу вядзе пераможнае сацыялістычнае наступленьне. Мы абяцаем у шмат разоў узмацніць нашы сілы і бязупынна змагацца за ажыцьцяўленьне пралетарскай дыктатуры ў Нямеччыне!

Капіталістычны сьвет рыхтуе адкрытае выступленьне супроць СССР. Камуністы, чырвоныя франтавікі забаронена, але існуючага саюзу, абяцаюць у адказ на вайну супроць краіны Саветаў абвясьціць грамадзянскую вайну супроць буржуазіі.

Лейпцыгская дэлегацыя абяцае савецкаму пралетарыяту змагацца ў першых радох за міжнародную справу рабочае клясы!

— Рот фронт!

Лейпцыгская дэлегацыя.
(Пераклад з мовы эсперанто).

Ліквідаваць „самастрахоўку" і рассылку непатрэбных копій

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

11 студзеня 1931 году.

1. Адзначыць, што, ня гледзячы на пастанову прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 1-XII—30 г. аб рашучай барацьбе з фактамі самастрахоўкі і непатрэбнай пасылкай шматлікіх копій, гэтыя факты яшчэ маюць месца і да апошняга часу.

2. Асабліва недапушчальным прызнаць ужываньне цэнтральнымі ўстановамі і арганізацыямі мэтады рассылкі абежнікаў, або паасобных даручэньняў раённым кіруючым арганізацыям (РК КП(б)Б, РКК-РСІ), замест таго, каб гэтыя даручэньні даваць непасрэдна падпарадкаванаму органу або асобе.

3. Забараніць усім цэнтральным установам і арганізацыям пасылаць абежнікі і даручэньні райкомам і райКК-РСІ без папярэдняга ўзгадненьня з ЦК і ЦКК-НК РСІ.

Прасіць усе райкомы і райКК-РСІ аб усіх выпадках парушэньняў гэтай дырэктывы паведамляць ЦКК-НК РСІ.

4. Паказаць тав. **Амбражунасу** (Лесбел), **Масюкову** (Наркамзем), **Пятровічу** (Белсельснаб) на недапушчальнасьць рассылкі абежнікаў райКК-РСІ з прапановай: «райКК-РСІ праверыць выкананьне адзначаных у абежніках прапаноў» без папярэдняга ўзгадненьня з ЦКК-НК РСІ.

5. Настанову апублікаваць у друку.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б РЫСЬКІН.

Пакончыць з ганебнай работай пошты

УПАУНАВАЖАНАМУ НКП і Т—тав. ДУБІНЕ

(АДКРЫТЫ ЛІСТ АД ІМЯ НАРАДЫ РЭДАКТАРОЎ РАЁННЫХ ГАЗЭТ)

Паважаны тав. Дубіна!

Нядаўна пры ЦК КП(б)Б адбылася нарада рэдактароў раённых газэт. На гэтай нарадзе была асабліва падкрэслена дрэнная работа паштовых аддзяленьняў, амаль ва ўсіх раёнах БССР. Аб гэтым гаварылі амаль усе рэдактары. Шкадавалі, што вас, тав. Дубіна, ня было на нарадзе. Нарада даручыла мне напісаць вам гэты ліст.

Пачну з фактаў.

Ці ведома вам, тав. Дубіна, што бабруйскае паштовае аддзяленьне хоча выканаць свой фінплян за кошт паніжэньня тыражу бабруйскай раённай газэты?

Бабруйская пошта ўлічыла, што цэнтральныя газэты даюць значна большыя прыбыткі, чым бабруйская газэта «Камуніст» і ва імя гэтых прыбыткаў тыраж «Камуніста» на 1931 год паменшыўся на 50 проц.

На Лепельскай пошце знайшлі пад сталом 1.500 экз. раённай газэты і 500 экз. цэнтральных газэт, ужо ўстарэўшых, і не адпраўленых падпісчыкам.

У м. Капылі раённая газэта «па міласьці» пошты пападае чытачу... на 7 дзень пасьля выхаду.

У Вушачах паштовыя работнікі сабралі падпіску і грошы палажылі сабе ў кішэню. Падпісныя лісты парвалі, а газэт сяляне не атрымліваюць.

У Полацку за газэты, якія дасылаюцца дармова, у парадку абмену, пошта патрабуе за кожны нумар 10 кап. у месяц.

Магілёўская пошта зусім не жадае прыняць для перасылкі быхаўскай газэты, якая друкуецца ў Магілеве, дзякуючы таму газэта надўна пралежала ў друкарні цэлы тыдзень і толькі пасьля вышэйшага АДПУ была адпраўлена на месца прызначэньня.

Амаль ні ў адным раёне, дзе выдаюцца газэты, пошта, ня гледзячы на дасланы вамі тыпавы дагавор, ня хоча фальцаваць газэты, а патрабуе, каб гэта рабілі рэдакцыі.

Ні ў адным раёне (з-за таннасьці раённых газэт) пошта ня прымае ніякіх крокаў для пашырэньня тыражоў газэт.

Варта спыніцца і на работе тэлеграфу ў раёнах. Пасьля ліквідацыі округ раёны пачалі атрымліваць шмат тэлеграм ад цэнтральных кіруючых устаноў. Як вразумець, напрыклад, такую тэлеграму, якая перадана раённым тэлеграфам:

— Некаторыя райкамолы не улічваюць налетычнай картасьці МОПР ДК тчк Катерынагочно прапануется разгорнуць МОПАР умацаваньня кадроў СКЛМ прыцягня адказности райкомола Секратэрэй».

Альбо тэлеграма ЦК КП(б)Б аб прыезьдзе 18 студзеня на нараду рэдактароў. Слова «нарада» ў тэлеграме адсутнічае; замест яго ў тэлеграме напісана: «Наўм адам роман денис Александр».

Можна было-б прывесьці яшчэ дзесяткі фактаў, але і гэтага досыць для ілюстраваньня работы органаў сувязі на месцах.

Нарада знайшла неабходным зьвярнуцца з гэтым лістом да вас, тав. Дубіна, для таго, **каб раз на заўсёды пакончыць з ганебнай работай паштовых кантор.**

Нарада пастанавіла прыйсьці на дапамогу пошце і ўключыцца ў трохмесячнік па ацэнцы работы органаў сувязі. Рэдакцыі газэт будуць ня толькі зьмяшчаць матар'ял аб работе органаў сувязі, але і прымуць актыўны ўдзел у гэтым агледзе.

Нарада спадзяецца, што вы паведаміце аб прынятых вамі мерах па паказаным вышэй фактах на старонках «Зьвязды».

Па даручэньні нарады рэдактароў пры ЦК КП(б)Б

ВАКСМАН.

ЦО КП(б)Б—газэце „Зьвязда"

ЦЭНТРАЛЬНАМУ ОРГАНУ КП(б)Б—ГАЗЭЦЕ «ЗЬВЯЗДА» ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД 5-ГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ЖУРАВІЦКАГА РАЁНУ. Калгасьнікі, беднякі і сярэднякі-адзіначасобнікі Журавічыны мабілізаваць сябе на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на рашучую барацьбу за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, за ліквідацыю кулацтва як клясы на базе шавіцкі ЦК!

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—КП(б)Б і яе бальшавіцкі ЦК.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Паважаны тав. рэдактар!

«Правда», «Зьвязда», «Рабочий» і інш. газэты ўзялі пад абстрэл жорсткай бальшавіцкай крытыкі недахопы ў падрыхтоўцы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі менскага гарадзкога савету, ход самай справаздачнай кампаніі, а таксама друкаваную справаздачну гарсавету, у якой зроблена шмат памылак і цэлы рад палітычна-шкодных блытаных установак. Мы цалкам згаджаемся з крытыкай і ацэнкай, якая сваячасова дана работе і справаздачы гарсавету яшчэ памянёнымі газэтамі. Дзякуючы сваячасовым сігналам з боку Менгаркому КП(б)Б, прэзыдыумам гарсавету быў прынят рад мерапрыемстваў для выпраўленьня нахаду ўсіх недахопаў і памылак.

На сёньняшні дзень у справаздачна-перавыбарчай кампаніі ўжо ёсьць пэўны пералом. Але гэты пералом яшчэ зусім невыстарчальны, а таму ўсім арганізацыям, і ў першую чаргу прэзыдыуму гарсавету, трэба значна ўзмацніць кіраўніцтва тым вялізарным энтузіязмам рабочае клясы і ўсяго працоўнага насельніцтва, які разгорнут вакол справаздачы гарсавету.

У рабоце гарсавету побач з дасягненьнямі моў месца пэўны рад буйных недахопаў, палітычных памылак і ў пасобных зьвеньнях апарату гарсавету—скажэньні клясавай лініі і праявы правага апартунізму на практыцы і «левых» загібаў. Сёньня адносная недадзенка рабочага забясьпячэньня з боку адзначаных арганізацый, асабліва з боку рабочай кааперацыі; недабудаваньне кулацка-пэманскіх элементаў і служак радзіцкага культу; перагібы пры муніцыпалізацыі будынкаў, «левыя» загібы пры калектывізацыі сельскае гаспадаркі і антысэрадняцкія перагібы пры індывідуальным абкладаньні; недадзенка нацыянальнага радам устанаў гарсавету, слабая работа на беларусізацыі, невыстарчальнае абсьлядоўваньне нацменшасьцей, слабая барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам — галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускім контр - рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам — агентам польскага фашызму, антысэмітызмам і шавінізмамі розных колераў.

Зусім дрэнна была разгорнута масавая работа гарсавету. Ён яшчэ не пераключыўся на новыя рэйкі работы, якія-б адпавядалі сучасным тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва, не мабілізаваў рабочай клясы на змаганьне за генэральную лінію партыі з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх, за выкананьне прамфінплану і ліквідацыю тых прарываў, якія мелі месца ў нашай прамысловасьці, за зьнішчэньне тых недахопаў, якія былі і цяпер ёсьць у рабоце апарату гарсавету.

Актыўнасьць рабочае клясы ў справаздачнай кампаніі гарсавету павінна быць узмоцнена і перанесена на выбарныя сходы. Перавыбарчыя сходы павінны актыўна і дэтальна абгаварыць наказ будучаму гарадзкому савету, які (наказ) прапануецца менскім гарадзкім камітэтам КП(б)Б. Трэба забясьпечыць пераважную большасьць месц у гарсавеце рабочым-ударнікам — дэпутатам нашых фабрык і заводаў, якія сапраўды пабальшавіцку змагаюцца за прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. Гэтым самым будзе значна абноўлен і умацован будучы склад гарсавету, што дасьць магчымасьць выправіць памылкі і недахопы, якія мелі месца ў яго рабоце.

Лічым патрэбным дадаць, што апартуністычная справаздача гарсавету складзена была над кіраўніцтвам Дзічкоўскага і Аксючыца, якія нясуць за гэта поўную адказнасьць. Цяпер справаздача выпраўлена ў форме дадатку да яе, які будзе надрукаваны.

АКСЮЧЫЦ, ДЗІЧКОЎСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ:

Да пытаньня аб выпраўленьні справаздачы гарсавету рэдакцыя яшчэ вернецца, калі атрымае паказаньні з лісьце т. т. Аксючыца і Дзічкоўскага «дадатак да справаздачы».

Тав. Каравін—начальнік міліцыі БССР

СНК БССР назначыў т. А. П. Каравіна начальнікам кіраўніцтва міліцыі і крымвышуку БССР.

Па сваім сацыяльным паходжаньні т. Каравін А. П. належыць да рабочых. Да рэвалюцыі працаваў дрэваапрацоўшчыкам і каменшчыкам.

У лістападзе 1917 г. т. Каравін А. П. уступіў у партызанскі атрад, які вёў барацьбу з немцамі-акупантамі. Акупанты захапілі т. Каравіна ў палон і кінулі ў Новазыбкаўскую турму, дзе ён прасядзеў 9½ месяцаў. У час знаходжаньня ў турме—т. Каравін не парываў сувязі з Чырвонай арміяй. 24 сьнежня 1918 г. т. Каравін вызваляецца з турмы і ў гэты-ж дзень назначаецца намесьнікам старшыні ЧК ў асвабаджанай ад акупантаў-немцаў мясцовасьці.

У 1919 г., калі ўспыхнула страшная паўстанне, т. Каравін з невялікай колькасьцю байцоў прымае самы актыўны ўдзел у барацьбе з паўстаньнем і ў боем першы займае г. Гомель, дзе і застаецца працаваць у органах ЧК.

Тав. Каравін у органах ЧК-ДПУ працаваў больш 12 год. Увесь час выбіраўся ў розныя партыйныя арганізацыі і савецкія ўстановы.

Зараз т. Каравін А. П. зьяўляецца кандыдатам у члены ЦК КП(б)Б

Паведамленьні

— **Вайсковы габінэт БДУ. На 31 студзеня** (масавы вайсковы дзень) **абор студэнтаў** БДУ назначаецца роўна ў 9 гадз. раніцы: для студэнтаў 1-га курсу ўсіх факультэтаў — актавая заля Хэм. Тэхн. Інстытуту для студэнтаў 3-га, 5-га і 7-га курсаў усіх факультэтаў — актавая заля галоўнага корпусу БДУ. Паходу ў поле ня будзе. Студэнты служачыя ад аўкі вызваляюцца.

— **Культпроп ЦК КП(б)Б** склікае 31 студзеня ў 11 гадз. раніцы (пакой 14) нараду па пытаньнях пастаноўкі партвучобы па радыё. На нараду выклікаюцца наступныя т. т.: Садоўскі, Масевіч, Наўмёнак (Белрадыёцэнтр), Макоўскі (Кампуз), Васілевіч (Усебеларуская саўпартшкола), Пятушкоў (Менск, гарком КП(б)Б), Баброў (Гомельскі гарком КП(б)Б) і Пракапчук (сакцыя навуковых працаўнікоў).

— **Ніжэйпаказныя т. т. павінны ў парадку партдысцыпліны зьявіцца 29 студзеня 31 г. роўна ў 4 гадз. дня ў Культпроп Менгаркому КП(б)Б:** Вержбаловіч, Палічанскі, Рубін, Родзіна, Эстрын, Стругач, Фалько, Цырлін, Брайнін, Жабінскі, Карачун, Лявоненка, Новікаў (рэд. «Зьвязды»), Сучкова Ш. (БДУ), Эпштэйн, Юшкевіч, Плашчынская (рэд. «Рабочай»), Левіт, Маўшовіч, Лебядзеў, Бэр (рэд. «Акцябр»), Маркаў, Паўлоўскі, Кучынскі (рэд. «Сав. Беларусь»), Крываносаў (хаміністытут), Аляксандровіч (БелАШП), Філіпенка (мэдінстытут), Лупчынскі (савбуд), Рагазінькінава (рэд. «Рабсялянка»), Вітліна (Культпроп ЦК).

— **БАН.** 30 студзеня г. г., у 7 гадз. веч., у памяшканьні катэдры марксызму-ленінізму (3-ці паверх, пакой 15) адбудзецца прагляд і канец дакладу тав. Аратуняна на тэму: «Да настаноўкі праблемы «Плэханаў — Ленін» у сувязі з сучаснай філёзофскай дыскусіяй». Уваход вольны.

— **Менская ГарКК КП(б)Б-РСІ** (вул. Энгельса, 28) выклікае на 30-1—31 г. у 12 гадз. дня сакратароў наступных ячэек і калектываў КП(б)Б для дачы тлумачэньня аб прычынах зьмяны і перанасу справаздачных і перавыбарчых сходаў гарсавету і тых сакратароў ячэек, дзе не адбыліся сходы групкомаў і ўтрымацаў:

Друкарня імя Сталіна, рымарная ф-ка, групком саюзу харчавікоў, набудова Дому Ўраду, групком № 2 Жыллкааперацыі, ф-ка «Камунарка», Электраабладнаньне, групком № 2 рабочых-будаўнікоў, кафлянны і бэтонны заводы, курсы чырвоных дырэктароў, швэйная ф-ка «Кастрычнік», абутковая майстэрня гарсавету, ячэйка саюзу працмастацтва, групкомы працасьветы р. 6, 7, 10, 13, школ 2, 4 і 5, цагельны камбінат, газэта «Пралетарыя», друкарня рэд. «Зьвязды», Белкалгасбуд, набудова фабрыкі-кухні, групком пэдфаку БДУ. Саюз транс. Хлебазавод, групкомы МІРК № 4, цэнтральны дзіцячы дом.

— **Менскі Гарсавет Асаавіяхіму.** 30 студзеня у 19 гадз. у вам. Дому Чырвонай арміі адбудзецца нарада сакратароў ячэек Асаавіяхіму г. Менску. Парадак дня: 1) Аб 5-й авіялётарэі; 2) Бягучыя справы.

Пагрэбні

У адозьве СНК СССР і ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, кааперацыйна-калгасных і камсамольскіх арганізацый «аб кантрактацыі драўных пасеваў 1931 году» («Зьвязда» № 22 ад 24 студзеня) у разьдзеле 1-ым, п. 3 пасьля слоў **«устаноўленых тэмпаў»** трэба ўставіць слова **«дзяржаўных».**

У п. 9 таго-ж разьдзелу замест **«рублёў па дзяржбюджэту»** трэба: **«рублёў па бюджэту».**

У п. 10 таго-ж разьдзелу ў 4 радзе зьнізу пасьля слоў **«сельска-гаспадарчую кааперацыю»** трэба ўставіць: **«Калгасцэнтр».**

У разьдзеле 4, у п. 3 пасьля слоў **«тавараў на суму»**, трэба ўставіць словы: **«ня менш»**

У п. 5 таго-ж разьдзелу замест слова **«прапановаьня»**, трэба **«арпацоўкі»** і замест **«у час уборкі»**, трэба **«перад уборкай».**

У п. 6 замест **«мінэральных угнаеньняў»**, трэба **«мінэральныя ўгнаеньні».**

У разьдзеле 5, у п. 3 пасьля слоў **«намячаецца будаўніцтва»** трэба ўставіць словы: **«ільняных і канаплеводчых».**

У перадавым артыкуле «Зьвязды» ад 28 студзеня ў 12 абзацы, паказана: «З пасобных мерапрыемстваў, зьвязаных з рэалізацыяй пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па дакладу Белжылсаюзу, трэба адзначыць задачу ўмацаваньня фінансавай гаспадаркі кааперацыйных сыстэмы». Трэба чытаць: «З пасобных мерапрыемстваў, зьвязаных з рэалізацыяй пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па дакладу Белжылсаюзу і г. д.»

Адказны рэдактар
С. БУРЭЙНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора
Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дарожным дадатком „Прафрух")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—90 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнасьць тэксту—у два разы дарожэй. Гіпатэкарныя рахункі выдаецца № 52|00601 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-й паверх, тел. 7-31.

Роспуск праўленьня Расьнянскага райспажыўтаварыства

Праўленьне Белкаапсаюзу пастанавіла распусьціць за анапартуністычную практыку і перакананьне на злачынства з боку асобных работнікаў кааперацыйнага апарату праўленьне Расьнянскага раённага спажывецкага таварыства.

Праўленьне ізнаравала партыйныя дырэктывы аб рабоце кааперацыі. Пасобным работнікі займаліся самазабясьпячэньнем і растрацілі шмат сродкаў. Справа аб злачынствах перадана пракуратуры.

Попел—саўгасам і калгасам

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. (Наш кар.). На лесазаводзе **«Пралетарыя»** каля 3-х месяцаў ляжыць паўтара вагоны попелу. Ніхто на цікавіцца адгрузкай попелу саўгасам і калгасам. Райсамчастка аб гэтым нават і ня ведае.

Тэатр пад замком

ДУБРОЎНА. (Наш кар.). Зьмы году назад у Дуброўне быў абсталяваны тэатр. Памяшканьне тэатру здавалася-б павінна было быць поўнасьцю выкарыстана. Між тым мясцовыя арганізацыі не арганізуюць у тэатры ніякай культурнай работы. **З самага пачатку зімы тэатр зачынены.**

Гэта зьявішча, бязумоўна, недапушчальна. Дуброўна — вялікі рабочы раён і мае патрэбу ў тэатры і кіно.

Ц.

Шосты Круглянскі

КРУГЛАЕ. (Наш кар.). 25 студзеня **адкрыўся 6-ты зьезд саветаў Круглянскага раёну.** У ганаровы прэзыдыум абрана **Палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. Андрэеў, Мянжынскі, Тэльман, Гей, Шаранговіч, Чарвяноў, Гападзеў, Калнін і Рыжоў.**

Зьезд заслухоў даклад ураду БССР. З рапартамі зьезду выступілі прадстаўнікі Ляськянскага сельсавету і саўгасу **Цяцерына.**

2-гі ўсебеларускі зьезд Асаавіяхіму

16 лютага ў Менску адкрываецца 2-гі ўсебеларускі зьезд Асаавіяхіму. На зьезд прыедзе каля 180 дэлегатаў з усіх раёнаў БССР. У парадку дня: справаздача ЦС Асаавіяхіму, даклад аб ваенным падрыхтоўцы працоўных, даклад аб навстрана-хімічнай абароне і інш.

Пасьля зьезду адбудзецца парада адказных сакратароў раённых і гарадзкіх арганізацый Асаавіяхіму. Зьезд і нарада працягнуцца каля 5 дзён.

Гарнізонныя курсы чырвонаармейскага актыву МОПР'у

З 20 па 22 студзеня ў Менску праходзілі курсы гарнізоннага чырвонаармейскага актыву МОПР'у.

Праз курсы прайшло 79 чырвонаармейцаў. Выпуск курсантаў адбыўся 23 студзеня на інтэрнацыянальным вечары, прысьвечаным ленінскім дням і задачам МОПР'у.

10.500 рублёў—у зімовы фонд дапамогі палітзьняволеным

За час з 15 сьнежня да 15 студзеня ў ЦК МОПР'у БССР паступіла ў фонд зімовай дапамогі палітзьняволеных капіталістычных турмаў і іх сем'ям 10.500 руб.

Зґубленыя і украдзеныя дакуманты

пічыць несапраўднымі

Дав. аб выб. пр. Мен. мін. Лысковец А. Я., 3760; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Сільвон Р. К., 3761; ордэр на кв. Жыльст. дав. аб пр. МІРК Жардзецкай Ф. П., 3762-3763; чл. біл. с. працасьвет. № 8538 Айзенштадт Н. Л., 3764; дапрыз. кн. Сьцеп. с.-с., мэтр. вып. Нарыч. РВК, квіт. аб упл. пая Астр.-Гар. спажл. т-ва, дав. аб пр. буд. кам. 4 стр. дыр. Длускага Н. Л., 3765-3768; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Ерахавец У. С., 3769; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Тупцыновіча П. Г., 3770; больн. лист. Астр.-Гар. адбул. Дуцскага Н. Л., 3771; мэтр. вып. Засл. мін. Суфрановіча В. А., 3772; пасьв. аб скапч. 7-годкі імя Чарвякова Галахова Е. І., 3773; вайск. біл. Сьміл. РВК Холад Л. Е., 3774; чл. біл. с. СГС № 9192 Кротава Е. Я., 3775; чл. біл. с. СГС № 4150 Пашкевіча М. А., 3776; студ. пасьв. Мед. палітэхн. сув. Пракопцова З. Ф., 3777; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Вапшкевіча Р. І., 3778; аўтаматаф. Дзяржбанку Скляпна В. Ш., 3779; чл. біл. № 5637 с. працасьв. Пікулік Е. С., 3780; пашп. кн. чыг. страхв. Балцэвіч Г. Я., 3781; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Рабцэвіча Р., 3782; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Рабцэвіч С., 3783; чл. біл. с. нарэзч. Сокалавай Ю. І., 3784.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
29 студзеня, 1 лютага
ДВА
вялікія сымфанічныя
КАНЦЭРТЫ
ў складзе 60 чал. Пад кіраўніцтвам дырыжэра-кампазытара заслужанага артыста мастацтва Р. М. ГЛІЕРА
Праграма канцэртаў: творы Гліера, 1-я і 2-я сымф. сюіты, балет „Яблочко", „Красный мак" і інш. Білеты прадаюцца выключна для членаў прафсаюзаў у раб. касе з 12—2 і 4—6 гадз., у касе тэатру з 12—2 і з 5—9 гадз. Пачатак у 9 гадз.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Лепшы савецкі фільм вытворчасьці Саюзкіно (трэсту Белдзяржкіно) РУБІКОН драма ў 7 частках
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 хв., 10 г. 30 хв.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
ВЕЦЕР З ПАРОГАЎ кіно-эпопея ў 8 частках
Зьвыш праграмы: ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ
ЭМІЛЬ КЕМПЭР — лепшы сатырык і ЖЕРВО 2— ТАНЦ-ЖОНГЛЁРЫ
Пачатак у 7 г., 9 г. 40 хв., і 10 г. 20 м.
Каса — з 5 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Сёньня і зьвыш
ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ
Зьвыш праграмы: КІНО-НАРЫС у 2 ч.
Наш уклад у пяцігодку
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм
НАЧНЫ КРЫК
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Лепшы гісторычны фільм вытворчасьці „Совкино"
ДВА БРАНЯВІКІ
ў 6 частках
Пачатак сэансу ў 1 гадз. дня
Каса зачынена—з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК"
З панядзелка, 26 студзеня
Баявік
Барацьба гігантаў
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансу: і с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадзін.

Менгарком КП(б)Б разам з ЦСПСБ
правядзіць 2-га лютага ў 7 гадз. веч. у Доме Камсьветы
зьлёт прамінваных рабочых
за першыя 2 гады пяцігодкі
в парадкам дня: «задачы прамінваных рабочых у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі».
Прапануецца ўсім-сакратаром партколектываў і яч. КП(б)Б атрымаць білеты для дэлегатаў зьлёту ў гаркоме КП(б)Б а 29-1 па 2-II-31 г. у пакоі № 10.
Менгарком КП(б)Б і ЦСПСБ.

СЁНЬНЯ, 29-га студзеня, у 7 гадз. вечары
адбудзецца
ў КАМВУЗЕ (Унівэрсыт., 27)
пасяджэньне камфракцыі т-ва ГІСТОРЫКАЎ-МАРКСЫСТАЎ,
пасьля чаго ў 8 гадз. вечары—ПАСЯДЖЭНЬНЕ ГІСТОРЫКАЎ-МАРКСЫСТАЎ.
—) Яўка абавязкова. (—

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 66)
На 31 студзеня склікаецца
АГУЛЬНЫ СХОД
пісьменьнікаў г. Менску
У парадку дня:
1) Даклад предсэдатэля ЦП саюзу паняроваліграфічнай прамысловасьці т. Федотава.
2) Палажэньне аб масьнікох пісьменьнікаў (В. Сташэўскі і Ц. Дагапольскі).
3) Выбары мясцоваму і рэвізійнай камісіі.
Явка ўсіх пісьменьнікаў абавязкова.
Пачатак у 7 гадз. вечара. Рэгістрацыя пачынецца ў 6 з пал. гадз. веч.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ імя Карла Маркса.
30 студзеня ў 7 з пал. гадз. вечары
адбудзецца
даклад т. МІЦЬКОВА:
„Становішча калектывізацыі па БССР, задачы воснавой сяўбы і чарговыя задачы ў галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі"
(па выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б).
Пасьля дакладу—канцэрт гарманістаў.
— Білеты ў гаркоме і чытальні Дому. —

Большавіцкі марш за якасьць
Рэдакцыя «Акцябр» склікае сёньня, 29-га студзеня, у 7 гадз. веч. у памяшканьні рэдакцыі (Рэвалюцыйная, 2)
пашыраную нараду „трыкутнікаў"
наступных прадпрыемстваў: швэйная ф-кі «Кастрычнік», абутковай ф-кі, шчотачнай, рымарнай скарняжнай», «Камунаркі», «Бальшавік» «Камунара» і усіх рабкуткорау. У парадку дня: 1) Усесаюзны марш за якасьць (даклад т. Стракоўская) 2) Бягучы справы.
Рэдакцыя «Акцябр»

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б
склікае на 2 лютага
НАРАДУ ЖАНАРГАНІЗАТАРАЎ усіх РК і ГК КП(б)Б
З наступным парадкам дня:
1) Выніці студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б.
2) Разгортваньне кампаніі: весьняная сяўба, задачы агітмасавай работы сярод батракоў і працоўных сялянаў.
3) Чарговая задача агітмасавай работы сярод работніц і жонак рабочых у 3-м годзе пяцігодкі.
4) Выніці справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдакцыйных сходаў.
5) Задача масавага жаночага друку ў 3-м годзе пяцігодкі і работа з рабселькорамі.

ЗАХОДНІЙ КАНТОРЫ МЭТЫЗАБ'ЯДНАНЬН